9 жніўня 2020 года
ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ПРАГРАМЫ КАНДЫДАТАЎ У ПРЭЗІДЭНТЫ 3–7

ЗДАЦЬ ТЭСТ НА КАРАНАВІРУС БЕЗ ЧАРГІ 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родны мове

# ЗВЯЗДА

4 ЖНІЎНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 149 (29263)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Пасланне Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу — гэта арыенцір у рабоце для ўсіх: дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый, суб'ектаў гаспадарання і для кожнага грамадзяніна. Маючае адбыцца выступленне кіраўніка дзяржавы — знакавая падзея. Яго асноўны адрасат — народ Беларусі — адзіная крыніца дзяржаўнай улады і носьбіт суверэнітэту. Менавіта яму ў найбліжэйшы час трэба будзе абраць Прэзідэнта нашай краіны. Па сутнасці — вызначыць свой лёс і будучыню нашай незалежнай дзяржавы».*

# ЖАЦЬ І ЖЫЦЬ ПА-БРАЦКУ





Больш за паўтары тысячы тон збожжа намалаціў маладзёжны экіпаж стрыечных братоў Андрэя і Сяргея ДРАЗДОЎ з ААТ «Рассвет імя К. П. Арлоўскага» Кіраўскага раёна. Характэрна, што і іх бацькі, родныя браты Мікалай і Анатоль ДРАЗДЫ, таксама працуюць у «Рассвеце» і ўжо таксама запісаліся ў тысячнікі.

БелТА.

## КОРАТКА

- **Дабрачынная кампанія Чырвонага Крыжа «Збяром дзяцей у школу» стартавала ў Беларусі.**
- Пункт пропуску «Лаварышкес» (сумежны беларускі — «Катлоўка») аднавіў работу з 4 жніўня, але ўезд у Літву пакуль дазволены не ўсім.
- **Больш за 18 мільёнаў чалавек у свеце заразіліся каранавірусам.**
- У Белавежскай пушчы праводзяць эксперымент па барацьбе з чырвоным дубам. Гэтая расліна-каланіст аказалася ў пушчы ў канцы XIX стагоддзя і ў новых умовах пачала выцясняць абарыгенныя віды дрэў.



ISSN 1990 - 763X

Спорт

## ЗАМЕНА АЛІМПІЯДЗЕ. БЕЛАРУСКАЯ ЛЁГКААТЛЕТЫЧНАЯ



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Перанос Алімпійскіх гульняў на наступны год — не прычына паслабляцца і губляць каштоўны спартыўны час. Беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі зладзіла свае гульні — Беларускія лёгкаатлетычныя. З 31 ліпеня да 2 жніўня нашы лёгкаатлеты планавалі выступаць у Токіа, але галоўным стартам сезона стаў чэмпіянат краіны. Спаборніцтвы, якія замянілі Алімпіяду, прайшлі з беларускім каларытам. «Акцэнтам на нацыянальнай беларускай культуры хацелі паказаць, што мы моцная, незалежная краіна, дзе жывуць дужыя целам і духам людзі», — адзначыў старшыня БФЛА Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

**Спалучэнне беларускай культуры, мовы і яркага спартыўнага відовішча стварыла на нацыянальным алімпійскім стадыёне «Дынама» сапраўднае свята каралевы спорту. На ім пабывалі і карэспандэнты «Звязды».**

СТАР. 13

Прыёмная кампанія — 2020

## ПРЫЯРЫТЭТЫ АБІТУРЫЕНТАЎ: ПРАГРАМАВАННЕ, МЕДЫЦЫНА, ЗАМЕЖНЫЯ МОВЫ

### ...а прахадныя балы ставяць новыя рэкорды

**31 ліпеня прыёмныя камісіі ВНУ завяршылі прыём дакументаў ад абітурыентаў, якія прэтэндавалі на бюджэтную форму навучання. Як заўсёды, апошні дзень і асабліва апошнія гадзіны падачы дакументаў атрымаліся вельмі напружанымі. Абітурыенты збіралі і аналізавалі інфармацыю, пралічвалі свае шанцы трапіць на бюджэт, забіралі свой пакет дакументаў і перападавалі іх не толькі на іншую спецыяльнасць у рамках той жа ВНУ ці факультэта, але і везлі іх у іншыя ўстановы адукацыі. У БНТУ такі ажыятаж стаў ужо традыцыйным, бо аднолькавы набор сертыфікатаў тут можна падаць на мноства тэхнічных спецыяльнасцяў. Да таго ж за тры гадзіны да закрыцця прыёмнай камісіі тут апублікавалі падказку для абітурыентаў — спецыяльнасці, дзе яшчэ заставаліся свабодныя бюджэтныя месцы.**

СТАР. 9



Фота прэс-службы БНТУ.

З першых вуснаў

# «МЫ НІЧОГА НЕ ЎТОЙВАЕМ, АЛЕ НАМ ПАТРЭБНА ПРАЎДА»

**У суботу Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў тры рабочыя сустрэчы — заслухаў даклад старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерыя Вакульчыка і старшыні Следчага камітэта Івана Наскевіча, абмеркаваў з кіраўніком часовай адміністрацыі ААТ «Белгазпрамбанк» Надзеяй Ермаковай сітуацыю ў банку, а Наталлі Качанавай і Віктару Шэйману даручыў аказаць падтрымку выбаркамам і паклапаціцца пра арганізацыю бяспекі іх работы.**



Фота БелТА.

«Мне ўсё часцей і часцей паступае інфармацыя аб тым, што не ўсюды ў нас спакойна хочуць правесці прэзідэнцкія выбары. А арганізаваць бяспеку на кожным участку — наш святы абавязак, — перадае словы беларускага лідара яго прэс-служба. — Вы бачыце, што робіца вакол. Няхай пакрычаць, пашумяць. Празмернасцяў быць не павінна. Не павінна быць так, што яны пачнуць нас крытыкаваць за тое, што мы выкарыстоўваем момант, каб недзе некага абмежаваць. Ёсць закон, згодна з законам павінна ісці перадвыбарная агітацыя і работа ўся».

Аляксандр Лукашэнка рэзюмаваў: «Віктар Уладзіміравіч — матэрыяльная частка, Наталля Іванаўна — арганізацыйная частка. Удакладніце ў Лідзіі Міхайлаўны Ярмошынай (кіраўнік Цэнтрвыбаркама. — **«Зв.»**), якая патрэбна падтрымка ёй і на месцах. Калі трэба, каб я падключыўся, тэрмінова мяне праінфармуйце».

Кіраўніку часовай адміністрацыі ААТ «Белгазпрамбанк» Надзеі Ермаковай у гэты ж дзень Прэзідэнт выказаў падзяку, што ў цяжкі момант яна адгукнулася і фактычна выратавала банк і працоўны калектыў.

«Вельмі прасіў бы, каб парадак быў у банку, банк згубіць нельга. Гэты банк, калі «Газпрам» ад яго адмовіцца, гасподзь з імі. Працоўны калектыў ёсць, навыкі ёсць, магчымасці будуць. Мы Нацыянальным банкам будзем падтрымліваць гэты банк: там жа нашы людзі і нашы прадпрыемствы. Так, трапілі ў складаную сітуацыю з-за гэтых карупцыйных праяў, але ў нас ёсць вопыт утрымання не проста на плаве банкаў, але і нармальнага іх функцыянавання», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што, як дакладваў яму старшыня Камітэта дзяржкантролю Іван Тэртэль, у банку няма катастрофы, а Надзеі Ермаковай і Ілоне Лядніцкай, намесніку старшыні Нацыянальнага банка, удалося стабілізаваць там сітуацыю. «Я зраблю ўсё для таго, каб і людзі, якія ўклалі свае грошы, і нашы прадпрыемствы нічога не страцілі. З нашага боку, з боку дзяржавы мы зробім усё неабходнае», — запэўніў Прэзідэнт.

Таксама 1 жніўня кіраўнік дзяржавы заслухаў даклад старшыні КДБ Валерыя Вакульчыка і старшыні Следчага камітэта Івана Наскевіча па сітуацыі з затрыманымі раней расіянамі са складу прыватнай ваеннай кампаніі.

«Многія факты (вы мне пісьмова далажылі) цікавыя. Я гляджу, прымоўклі і нашы старэйшыя браты. Ужо не крычаць, што яны пасылалі гэтых людзей у Стамбул. Ніякага Стамбула не было і быць не магло, як аказалася на паверку. Зразумела, што ў гэтай групы былі іншыя мэты», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Па словах Прэзідэнта, высветлілася, што затрыманыя — першая група са 180 або 200 чалавек, якія планаваліся для перакідкі ў Беларусь. Лідар краіны растлумачыў, што заўсёды, якія мерапрыемствы ні праводзіліся б у Беларусі з удзелам расійскіх ваеннаслужачых, былых або дзеючых, адпаведныя ведамствы дзвюх краін узаемадзейнічаюць.

«У нас дазвол толькі Прэзідэнт можа даць на прыезд ваеннаслужачых, на наведванне Беларусі. З тэхнікай, без тэхнікі, самалёты, верталёты і гэтак далей... Ніякіх дазволаў нікто не даваў. Больш за тое, у нас выклікаюць сур'ёзныя сёння падазрэнні тыя мэты, якія сабе група намячала», — дадае прэс-служба Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларускі бок адкрыты для ўзаемадзеяння па сітуацыі і «на хлусні мы палітыку не пабудуем»: «Перакрыкваючы адно аднаго ў СМІ, пытанне не вырашым. Таму, калі ў каго-небудзь ёсць жаданне з расіян атрымаць дадатковую інфармацыю, мы заўсёды адкрыты. Мы нічога не ўтойваем, але нам патрэбна праўда».

Следства вядзе Следчы камітэт, аператыўнае суправаджэнне — за КДБ і міліцыяй. «Падключайце людзей, калі вам трэба, аператыўніку. Працуйце акуратна. Але праўда павінна быць прад'яўлена грамадству», — адзначыў Прэзідэнт.

Парламенцкі дзённік

# ПЕРАД ПАСЛАННЕМ

## Учора адкрылася трэцяя пазачарговая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання

**Яе адкрыццё для заслухоўвання Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту прадугледжана ўказам кіраўніка дзяржавы ад 24 ліпеня. Учора Палата прадстаўнікоў у гэтай сувязі вырашыла працэсуальныя пытанні. Акрамя таго, яна разгледзела тры законапраекты, якія датычацца двухбаковых адносін Беларусі з іншымі дзяржавамі.**

Парламентарыі ратыфікавалі выканаўчую праграму паміж урадамі Беларусі і Егіпта аб супрацоўніцтве ў сферы вышэйшай і паслявузаўскай адукацыі.

Па словах **старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ**, адносіны паміж Беларуссю і Егіптам развіваюцца вельмі дынамічна па самым шырокім коле кірункаў. Спікер ніжняй палаты нагадаў пра візіты Прэзідэнта Беларусі ў Егіпет у 1998, 2017 гадах і ў лютым гэтага года, а таксама пра леташні візіт Прэзідэнта Егіпта ў Мінск.

«Дагаворна-прававая база нашых двухбаковых адносін уключае каля 50 міжнародных дагавораў, у іх ліку гандлёвае пагадненне, пагадненне аб эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, узаемадзеянні ў інавацыйнай, падатковай і іншых сферах», — сказаў ён.

Міжурадавая выканаўчая праграма прадугледжвае супрацоўніцтва ў сферы вышэйшай адукацыі і адукацыі пасля завяршэння ВНУ. Яна была падпісаная ў лютым гэтага года ў Каіры падчас афіцыйнага візіту туды Прэзідэнта нашай краіны.

**Міністр адукацыі Беларусі Ігар КАРПЕНКА** паведаміў дэпутатам, што палажэнні выканаўчай праграмы развіваюць нормы міжурадавага пагаднення ў галіне вышэйшай адукацыі, якое было падпісанае ў 1998 годзе, і прадугледжваюць арганізацыю на парытэтных умовах і на падставе конкурснай заяўкі штогадовага абмену на поўны курс навучання ва ўстановах вышэйшай адукацыі абедзвюх дзяржаў студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. Ён паведаміў, што кожны навучальны год на такіх умовах будуць прымаццa чатыры чалавекі на навучанне ў ВНУ і яшчэ адзін — у аспірантуру. Навучанне будзе бясплатнае з выплатай стыпендый. Выканаўчая праграма таксама прадугледжвае накіраванне выкладчыкаў ва ўстановы адукацыі краіны-партнёра.

Міністр праінфармаваў, што зараз у Беларусі навучаецца каля 50 егіпецкіх студэнтаў, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт рыхтуе кадры для мэблевай прамысловасці Егіпта, у Нацыянальным дзіцячым аздараўленчым цэнтры «Зубраня» ў канцы жніўня плануецца прыём каля 20 дзяцей з гэтай краіны.

У парадак дня пазачарговай сесіі былі таксама ўключаныя законапраекты аб далучэнні Беларусі да Пратакола аб абмене інфармацыяй у электронным выглядзе паміж удзельнікамі СНД для ажыццяўлення падатковага адміністравання і аб ратыфікацыі Пагаднення аб асаблівасцях ажыццяўлення аперацый з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі ў рамках ЕАЭС. Абодва дакументы былі прынятыя.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прагаласавалі за правядзенне сумеснага з Саветам Рэспублікі пасяджэння для заслухоўвання штогадовага Паслання Прэзідэнта Беларусі беларускаму народу і парламенту, якое будзе агучана сёння, 4 жніўня, у Палацы Рэспублікі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Рыхтуецца першая рэгістрацыя вакцыны ад каранавіруса



Рэгістрацыя першай вакцыны ад каранавіруса ў Расіі чакаецца на працягу дзесяці дзён. Пра гэта паведаміў кіраўнік расійскага Фонду прамых інвестыцый (РФПІ) Кірыл Дзмітрыеў у эфіры тэлеканала «Расія 24».

Паводле яго слоў, калі ў найбліжэйшы час адбудзецца рэгістрацыя, краіна абгоніць па тэрмінах ЗША і іншыя краіны. «Гэта будзе першая зарэгістраваная вакцына ад каранавіруса», — падкрэсліў ён. У канцы года краіна штомесяц будзе вырабляць 10 мільёнаў доз прэпарату, адзначыў Дзмітрыеў.

Раней кіраўнік Мінпрамгандлю Дзяніс Мантураў казаў пра некалькі мільёнаў доз у месяц да пачатку 2021 года. Ён дадаваў, што серыйны выпуск вакцыны, распрацаванай Цэнтрам імя Гамалеі, пачнецца ўжо ў верасні. Масавую бясплатную вакцынацыю грамадзян у Міністэрстве аховы здароўя планавалі арганізаваць у кастрычніку. Першыя ж атрымаюць медыкі і настаўнікі.

3 жніўня ў Мінабароны зрабілі справаздачу аб канчатковых выніках тэсціравання прышчэпкі на добраахвотніках. Вынікі медыцынскай дыягностыкі паказалі, што ва ўсіх паддоследных ёсць адваротны імунны адказ і няма пабочных эфектаў. Гэта сведчыць пра бяспеку прэпарата і пра тое, што ён добра пераносіцца.

## Пляжы Балгарыі забруджаны пальмавым алеем



Адпачывальнікі на паўднёвых пляжах чарнаморскага ўзбярэжжа Балгарыі масава паведамляюць уладам пра выкіданне з мора шарыкаў пальмавага алею, паведамляе выданне BgNews.

У асобных месцах пасля чысткі пляжаў экаактывісты і адпачывальнікі сабралі сотні кілаграмаў гэтага тлушчу. «Пальмавы алей шкодзіць марской экасістэме, нават пах яго перашкаджае нармальнаму адпачынку на пляжы і стварае пагрозу здароўю, асабліва дзяцей. Менавіта таму мы, не чакаючы ўлад, распачалі спробу пачысціць пляж», — заявіў экаактывіст Барыс Садоў.

Аднак у марской адміністрацыі Варны адмаўляюць небяспеку забруджвання, адзначаючы, што пальмавы алей — раслінны прадукт і марскім насельнікам нічым не пагражае. Там выказалі здагадку, што прадукт трапіў у ваду з борта аднаго з суднаў, якія праходзяць у міжнародных водах, а неспрыяльная сітуацыя ўзнікла з-за надвор'я, бо вецер адправіў алей непасрэдна да берага.

Санітарныя службы ўзялі ўзоры прадукту для правядзення даследаванняў, але вынікі пакуль не гатовыя. Сітуацыя тым часам пагаршаецца. Алейныя шарыкі дасягнулі пляжаў у самай паўднёвай частцы чарнаморскага ўзбярэжжа ў раёне горада Ахтопал.

## Мужчына адбіўся ад babкракадзіла мачэтэ



У мексіканскім штаце Юкатан кракадзіл напаў на мужчыну, які працаваў у полі. Пра гэта паведамляе выданне The Yucatan Times.

Рэптылія схапіла 60-гадовага Сантаса Н. зубамі, аднак у таго атрымалася адбіцца ад яе пры дапамозе мачэтэ. Паранены кракадзіл адпусціў мужчыну і схаваўся. Пацярпелага даставілі ў бальніцу на прыватным аўтамабілі з моцным крывацёкам.

З'яўленне кракадзіла ў полі, як мяркуецца, тлумачыцца моцнымі дажджамі, якія прайшлі ў рэгіёне. Нязвыклы да людзей драпежнік мог прыпаўзці з балота і, сустрэўшы чалавека, праявіў агрэсію.

На паўвостраве Юкатан распаўсюджаныя цэнтральнаамерыканскія кракадзілы. Часцей за ўсё іх даўжыня складае ад 1,5 да 2,7 метра, аднак сустракаюцца асобныя даўжынёй да 4,5 метра, якія важаць 400—450 кілаграмаў. Прадстаўнікі гэтага віду рэдка нападаюць на людзей.

# Разам ЗА БЕЛАРУСЬ!

## Перадвыбарчая праграма кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Аляксандра ЛУКАШЭНКІ

### ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!

Мы павінны будзем вызначыць **БУДУЧЫНЮ НАШАЙ БЕЛАРУСІ.** Краіны, якую мы будавалі чвэрць стагоддзя разам, сваёй працай ствараючы сучаснае аблічча новай еўрапейскай дзяржавы.

Да сваёй мэты ішлі шляхам мірнага тварэння.

Атрымалі суверэнітэт у межах існуючых граніц Беларусі. **На абломках вялікай Савецкай імперыі стварылі незалежную дзяржаву, упершыню ў гісторыі!**

У надыходзячы час мы зробім усё неабходнае для ўмацавання, захавання і прымнажэння яе асноў.

Усякая палітыка (знешняя і ўнутраная) толькі тады чагосьці вартая, калі яна прыносіць у выніку карысць людзям. Таму лозунг **«Дзяржава для народа!»** вызначае галоўныя напрамкі развіцця.

### БЕЛАРУСЬ — КРАІНА МАГЧЫМАСЦЯЎ

Забеспячэнне міру і бяспекі грамадства даўно стала нашым брэндам. Беларусь ёсць і будзе краінай для творчага развіцця асобы.




Пры наяўнасці ў чалавека мэты і жадання яе дасягнуць дзяржава працягне ствараць усе неабходныя ўмовы для яе рэалізацыі. Але ўсе павінны разумець, што без штодзённай працы іх мары застануцца проста марамі.

### АСАБІСТАЯ АДКАЗНАСЦЬ КОЖНАГА ЗА ЛЁС КРАІНЫ

Па меры таго як мянялася наша Беларусь, мяняліся мы. Гатоўнасць беларусаў браць на сябе адказнасць за лёс краіны відавочная.

І ступень гэтай адказнасці ўстановіць сам народ.

Але па законе! Не на вуліцах і плошчах, а праз прававыя адносіны.

Пачнём з Канстытуцыі.



Беларусы падчас усенароднага абмеркавання вызначаць свае правы, свабоды і абавязкі, а таксама паўнамоцтвы органаў дзяржаўнай улады.



### ГАЛОЎНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ — ЛЮДЗІ І СПРАВЯДЛІВАЕ СТАЎЛЕННЕ ДА ІХ

Мы бачым нашы перспектывы і шляхі дасягнення новых мэт.

Эпоха лічбавізацыі і штучнага інтэлекту — эпоха высокаадукаваных людзей. Таму асноўную ўвагу аддадзім новай якасці адукацыі і яе адаптацыі да патрэб жыцця грамадства.

**Адукацыю захаваем даступнай і сучаснай.**

Усямерная падтрымка дзяржавы тым, хто жадае і гатовы вучыцца, і надалей будзе гарантаванай. Будуць удасканалены праграмы і методыкі адукацыйнага працэсу як у школе, так і ў ВНУ.

Адукацыя будзе практыкаарыентаванай.

У новым фармаце ўступных экзаменаў у сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы будзе ўлічаны вопыт і тэсціравання, і сумоўя з абітурыентам.



Пандэмія паказала, наколькі важнае для абароны і развіцця краіны здароўе чалавека. **Адукацыя і ахова здароўя будуць аднолькава даступныя ўсім беларусам і фінансавацца дзяржавай.** З улікам работы сістэмы аховы здароўя ва ўмовах эпідэміі COVID-19 дзяржава працягне актыўна інвеставаць ва ўдасканаленне і развіццё існуючых медыцынскіх цэнтраў, бальніц і паліклінік.

### АД ЗАХАВАННЯ — ДА ПРЫМНАЖЭННЯ

У сферы эканомікі мы не пойдзем на шокавую тэрапію. Таму што расплачвацца за радыкальныя рэформы будуць самыя неабароненыя пласты насельніцтва — тыя, хто ўсё жыццё працаваў і ўздымаў краіну з руін перабудовачнай эпохі.

**Нашы рэформы — гэта ўдасканаленне таго, што створана.**

Нельга дапусціць злому сістэмы і забраць у людзей гады стабільнага і шчаслівага жыцця, як гэта адбывалася і адбываецца ў шэрагу краін свету. Аднавіцца пасля такіх узрушэнняў практычна немагчыма.

**Безумоўным прыярытэтам застанецца рост даходаў грамадзян.**

На працягу пяцігодкі сярэдняя заработная плата ў Беларусі вырасце ў 2 разы.

Для гэтага мы дадзім максімальную падтрымку інвестарам, перш за ўсё нацыянальным. Тым, хто гатовы сумленна і справядліва ўкласці грошы ў нашу краіну, будуць забяспечаны максімальна простыя працэдуры вядзення бізнесу. Абсалютна роўныя магчымасці і ўмовы для прыватных і дзяржаўных кампаній.

Сітуацыя паказала, наколькі важна ліквідаваць залежнасць краіны ў нафтагазавай, фінансавай і іншых сферах. Вырашаючы гэтыя пытанні, будзем прытрымлівацца сусветных тэндэнцый стварэння новых галін эканомікі. У нас гэта добра атрымліваецца (ПВТ, атамная энергетыка, космас). Працягнем актыўную лічбавізацыю і фарміраванне паўнавартаснай «зялёнай эканомікі» (экапрадукты, электратранспарт, аднаўляльная энергія).



Захаваўшы традыцыйныя вытворчасці, на якіх Беларусь адбылася як незалежная дзяржава, развіваючы новыя кірункі, мы выйдзем на сярэднесусветныя тэмпы эканамічнага развіцця.



### АСАБЛІВАЯ ЎВАГА — РЭГІЁНАМ

Трылогія «Малой радзімы» паказала, наколькі беларусы прывязаныя да роднай зямлі і чакаюць ад улады прагрэсіўных рашэнняў.

Прыйшоў час звярнуць самую пільную ўвагу на размеркаванне прадукцыйных сіл краіны. Дзякуючы перспектыўным праектам у малых гарадах і пасёлках людзі будуць жыць не горш, чым у абласных цэнтрах і сталіцы. Новая якасць аграрнай эканомікі падыме прэстыж працы і жыцця людзей у вёсцы.

**Вытокі сучаснай Беларусі — у сельскім укладзе.** Наш гістарычны абавязак — знайсці гаспадароў для тысяч пакінутых зямельных участкаў. Прапанаваць найлепшыя ўмовы для будаўніцтва індывідуальнага жылля. Для тых, хто зробіць такі выбар, мы створым неабходную інфраструктуру (хуткасны транспарт, хуткія дарогі) і забяспечым сучасныя сацыяльныя стандарты (школы, дзіцячыя сады, паліклінікі, забаўляльныя цэнтры, спартыўныя пляцоўкі). Усё гэта дазволіць рэгіёнам стаць цэнтрамі прыцягнення для жыцця.



### БЕЛАРУСЬ — ДОНАР СТАБІЛЬНАСЦІ

На працягу чвэрці стагоддзя мы з вамі будавалі Беларусь — наш агульны дом з вокнамі і на Усход, і на Захад. Мы заўсёды былі адкрытыя для сяброўства і супрацоўніцтва. Ніколі не ўмешваліся ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў. Наша міралюбная дыпламатыя была і застанецца залогам бяспекі беларусаў.

Але мы ўступаем у эпоху глабальных геапалітычных узрушэнняў.

Будзе зроблена ўсё, каб рознагалоссі ў знешняй палітыцы не адбіліся на дружбе народаў, якім наканавана жыць побач на гэтай зямлі ў цэнтры Еўропы, а геаграфія дружалюбных нам краін пашырылася.

Дарагія беларусы,
грамадзяне краіны!

### НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ КАШТУЕ ДОРАГА, АЛЕ ЯНА ВАРТАЯ ТАГО, КАБ ЯЕ ЗАХАВАЦЬ І ПЕРАДАЦЬ НАСТУПНЫМ ПАКАЛЕННЯМ.

**ЗА** намі — **БЕЛАРУСЬ!**

Ал. Лукашэнка



# ЭВОЛЮЦИЯ ВЛАСТИ

## Предвыборная программа кандидата в Президенты Республики Беларусь Сергея ЧЕРЕЧНЯ

### СОЗДАТЬ УСЛОВИЯ ДЛЯ РАЗВИТИЯ МАЛОГО И СРЕДНЕГО БИЗНЕСА

**Частная инициатива — главный двигатель экономики.** Роль государства должна быть минимизирована во всех сферах. Чиновники должны не ограничивать бизнес, а содействовать его развитию и создавать условия для предпринимательской инициативы. Нужна экосистема для развития предпринимательства — бизнес-инкубаторы и фонды поддержки бизнеса с привлечением профильных международных институтов. **Английское право и снижение налоговой нагрузки** должны быть доступны не только ПВТ, но и всему бизнесу в Беларуси. **Меньше проверок и бюрократии.** После тщательного аудита убрать все бессмысленные формальные лицензии и процедуры, мешающие бизнесу работать. Сократить полномочия проверяющих и упразднить лишних.

**Вместо неэффективных колхозов — успешные фермерские хозяйства.** Земля по праву принадлежит не чиновникам из исполкомов, а людям, которые ее обрабатывают. Обеспечить возможность работникам аграрных предприятий участвовать в их приватизации и создавать собственные частные фермерские хозяйства на максимально простых условиях.

**Провести честную и прозрачную приватизацию.** Малые и средние госпредприятия должны быть приватизированы по понятным правилам, с размещением информации в открытых источниках. Работники будут иметь право принимать участие в приватизации предприятий. Государство должно заниматься только инфраструктурными проектами.

### ВЕРНУТЬ БЕЛОРУСАМ ПОДДЕРЖКУ И ЗАЩИТУ ГОСУДАРСТВА

**Помогать оставшимся без работы.** Каждый житель Беларуси должен быть уверен, что государство в такой ситуации обеспечит достойное пособие и бесплатное переобучение на востребованные специальности. **Отмена «налога на тунеядство» в любом виде:** заставлять людей платить за то, что они потеряли работу, — абсурд. **Заслуженные пенсии платить полностью** — независимо от того, продолжает ли пенсионер работать. **Честно считать рабочий стаж,** включая службу в армии, учебу и декретный отпуск.

**Приоритет для бюджета — качественное и по-настоящему бесплатное медицинское обслуживание: на здоровье не экономят.** Никаких закрытых лечебниц для начальства: хорошие поликлиники и больницы должны быть доступны всем. **Главные в вопросах безопасности здоровья — врачи, а не чиновники.** Принимать решение о действиях государства в случае эпидемии должны специалисты-медики, а не администрация президента. **Достойные зарплаты и условия труда врачей и учителей:** без вынужденного труда на 1,5-2 ставки и бессмысленной бумажной работы. **Признать европейские сертификаты на лекарства:** недопустимо навязывать людям белорусские аналоги или заставлять искать себе лекарства за границей.

**Образование европейского уровня.** От детского сада и до университета — в системе образования нужно ориентироваться на лучшие мировые



практики. Затраты окупятся высоким качеством будущих специалистов. **Студентам должны быть доступны академические обмены как минимум на семестр. Отмена обязательного распределения** — это экономически неэффективный пережиток, который только вредит десяткам тысяч молодых специалистов.

**Ценообразование ЖКХ — прозрачное, рост тарифов остановить.** Цены в жировках растут, а качество услуг — нет. Чтобы это изменить, тарифы будут прозрачными, а ЖЭСы будут конкурировать с частными обслуживающими компаниями.

**Обеспечить нерушимость частной собственности.** Частный дом на пути застройщика или частный бизнес на пути госкомпании — каждый должен быть уверен, что результат его труда, вложенных сил и времени не смогут отобрать.

### СОЗДАТЬ КОМФОРТНУЮ СРЕДУ ДЛЯ ЖИЗНИ

**Доступное жилье для всех.** Вместо ненадежного долевого строительства необходимо развивать ипотеку, для первой квартиры — под сниженный процент. Каждая семья и каждый работающий человек заслуживают возможность жить в своем доме.

**Забота о детях — забота о будущем.** Декретное пособие необходимо увеличить до уровня, позволяющего достойно растить детей. Материнский капитал должен быть доступен с рождения ребенка. **Детские сады без очередей:** бюджетная поддержка должна распространяться и на частные учреждения с возможностью выбирать дополнительные услуги за дополнительную плату. **Доступное частное образование:** убрать барьеры для развития частных школ и университетов. Достойные бюджетные стипендии для талантливых учеников.

**Люди с инвалидностью — наравне со всеми.** Безбарьерная среда должна существовать не на бумаге, а в каждом доме, торговом центре и госучреждении. Вся помощь должна попадать напрямую людям с инвалидностью — это значительно улучшило бы их материальное и социальное положение даже без увеличения бюджетных затрат.

**Посещение современного спортивно-оздоровительного центра должно стоить дешевле бутылки пива.** Для поддержки здорового образа жизни государство будет компенсировать каждому желающему стоимость обычного абонемента в бассейн или тренажерный зал.

### ОБЕСПЕЧИТЬ ДЕМОКРАТИЮ И ЗАКОННОСТЬ

**Свободные и честные выборы.** Чтобы народ был властью, голоса избирателей нужно считать прозрачно. У всех кандидатов должен быть равный доступ к средствам массовой информации.

**Прямая демократия и выборы местной власти.** Вместо назначаемых сверху председателей исполкомов должны быть избираемые людьми мэры. Тогда местные власти будут заботиться о благополучии людей и решать их проблемы, а не ждать указаний из столицы. Каждый регион должен самостоятельно распоряжаться своим бюджетом и иметь все необходимые полномочия для важных местных решений. Часть бюджета расходуется по результатам прямого голосования людей (партисипативное бюджетирование).

**Верховенство права вместо привилегий для избранных.** Закон должен быть един для всех — и для чиновника, и для предпринимателя, и для пенсионера. Для инвесторов должны быть прозрачные условия, а не кулуарные договоренности. **«Табакеркам» не место на наших улицах — это яркий пример того, как государство заботится не о людях, а о приближенном крупном бизнесе, давая ему монопольные возможности.**

### СДЕЛАТЬ ГОСУДАРСТВО ОБСЛУЖИВАЮЩИМ СЕРВИСОМ ДЛЯ ГРАЖДАН

**Качество госуслуг должны оценивать их потребители:** нужна прозрачная система оценки полезности и эффективности работы госучреждений в разрешении запросов граждан. **Зарплата чиновника должна зависеть от эффективности его работы** и оцениваться по ясным целевым показателям. Зарплаты госслужащих должны быть не высокими или низкими, но обоснованными и справедливыми. **Высшие чиновники должны ежегодно подавать публичные декларации** о доходах и имуществе, чтобы предотвратить незаконное обогащение и коррупцию.

**Один адрес вместо «Одного окна».** Все государственные услуги должны быть доступны в одном современном здании, где людей будут обслуживать по стандартам хорошего сервиса. **«Принесите справку» — никогда больше:** между государственными органами должен осуществляться исключительно электронный документооборот в единой системе данных. Если в распоряжении государства уже есть какая-то информация, то чиновники должны запрашивать ее друг у друга, а не требовать у людей повторно. **Для желающих все государственные услуги должны предоставляться также в электронном виде, без выхода из дома.**

**Передать управление госпредприятиями от чиновников специалистам.** Отказаться от практики влияния исполкомов на работу госпредприятий. На всех инфраструктурных государственных предприятиях должны действовать независимые компетентные советы директоров из опытных экспертов.

**Эффективная судебная система.** Решения судов должны приниматься без волокиты и исполняться в срок, особенно это касается решений хозяйственных судов по контрактам.

### ПОДДЕРЖКА НАЦИОНАЛЬНОЙ ИДЕНТИЧНОСТИ И ГУМАННЫХ ЦЕННОСТЕЙ

**Учим английский, поддерживаем белорусский, используем русский.** Хорошее владение английским языком — основа развития науки, бизнеса и инноваций. Белорусский язык — неотъемлемый элемент нашей национальной идентичности, который нужно изучать и сохранять на государственном уровне, но без какого-либо принуждения. **Для всех желающих должно быть доступно образование на белорусском языке.**

**Возвращение исторических флага и герба.** Бело-красно-белый флаг и герб «Погоня» — важные символы, под которыми Беларусь боролась за свою независимость и обрела ее, поэтому они должны сопровождать будущее развитие нашей страны. **Вопрос о государственных символах должен решаться народом на честном референдуме.**

**Мораторий на смертную казнь.** Государство не должно лишать своих граждан жизни — это негуманно и делает судебную ошибку неисправимой. Беларусь введет мораторий на смертную казнь, как это сделали все наши соседи и все европейские страны.

**Животные тоже имеют права.** Нужно принять закон о защите животных, опираясь на опыт европейских стран и предложения зоозащитников.

### МИРНАЯ БЕЛАРУСЬ, ОТКРЫТАЯ ДЛЯ МИРА

**Никакой интеграции по непрозрачным механизмам.** Вступление в любые международные организации и союзы должно быть одобрено на всенародном референдуме. Интеграционные документы нельзя подписывать кулуарно.

**Объявление нейтралитета.** Беларусь не хочет ни с кем воевать, поэтому нам не нужно вступать в военные блоки, будь то НАТО или ОДКБ. В Беларуси не могут размещаться иностранные военные базы. **Отменить обязательную службу в армии:** безопасность будет обеспечивать профессиональная и современная армия на контрактной основе. Отмена обязательного призыва сэкономит государственные ресурсы и годы жизни молодых людей.

**Безвизовый въезд в шенген — приоритет.** Для удобства людей государство должно вести переговоры с ЕС и принимать все меры для скорейшей отмены виз. **Реализовать совместные с соседями проекты по развитию пограничной инфраструктуры, чтобы пересечение границы занимало не более получаса.**

**Не мешать уехать, а создавать стимулы вернуться.** Молодежь хочет посмотреть мир, а кому-то предложили хорошую должность в соседней стране — в этом нет ничего страшного. Государство должно не строить преграды на пути граждан, но создавать привлекательные условия для возвращения на родину талантливых людей с багажом международного опыта.

**Вместе мы сможем сделать Беларусь страной для счастливой и комфортной жизни. Читайте полную версию программы на cherechen.by и голосуйте за Сергея Черечня.**

# «ГАВАРЫЦЬ ПРАЎДУ. ЦАНІЦЬ ЛЮДЗЕЙ. ЗМЯНЯЦЬ УЛАДУ»

## Перадвыбарчая праграма кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Андрэя ДЗМІТРЫЕВА

### 10 першых крокаў НОВАГА ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ:

1. Сфарміраваць пераходны ўрад разам з альтэрнатыўнымі кандыдатамі ў Прэзідэнты і правесці прэзідэнцкія і парламенцкія выбары з новым складам Цэнтральнай і ўчастковых выбарчых камісій.
2. Абмежаваць знаходжанне на пасадзе прэзідэнта двума тэрмінамі; забяспечыць падзел улад і выбарнасць грамадзянамі кіраўнікоў гарадоў і раёнаў.
3. Адмяніць прыніжальную кантрактную сістэму пры найме на работу.
4. Устанавіць сярэднюю пенсію ў памеры не менш за 60 працэнтаў ад сярэдняй заработнай платы па краіне.
5. Рэфармаваць прамысловыя прадпрыемствы. Хранічна стратныя — прыватызаваць. Скарочаным работнікам выплачваць дапамогу не менш за 2/3 акладу на працягу 6 месяцаў і забяспечыць перанавучанне.
6. Падтрымаць бізнес у малых і сярэдніх гарадах, рэалізаваць «Нацыянальную платформу бізнесу».
7. Скараціць колькасць чыноўнікаў. Правесці публічныя праверкі на прадмет кумаўства ў органах улады і сувязяў улады і бізнесу.
8. Прадаць большасць рэзідэнцый сённяшняга прэзідэнта, грошы вярнуць у бюджэт.
9. Палепшыць матэрыяльна-тэхнічную базу ўстаноў аховы здароўя. Абсталяванне МРТ, КТ, УГД для максімальнай колькасці паліклінік, праграма «Жыллё для маладых медыкаў».
10. Вызваліць настаўнікаў ад нагрузкі, не звязанай з навучаннем і выхаваннем дзяцей. Забараніць паборы ў дзіцячых садках і школах. Увесці ў ВНУ размеркаванне па жаданні.

### СУЧАСНАЯ І СПРАВЯДЛІВАЯ ДЗЯРЖАВА

*Роўнасць усіх перад законам і падзел улад зробіць Беларусь багатай і стабільнай краінай.*

**Канстытуцыйная рэформа.** Беларусь павінна быць парламенцка-прэзідэнцкай рэспублікай. Адна і тая ж асоба не павінна займаць пасаду Прэзідэнта больш за два тэрміны. Скараціць паўнамоцтвы прэзідэнта, якія перашкаджаюць падзелу ўлад і эфектыўнай рабоце дзяржавы.

**Рэформа сістэмы мясцовага самакіравання.** Падпісаць Еўрапейскую Хартыю мясцовага самакіравання. Увесці прамыя выбары мясцовых кіраўнікоў і зрабіць іх залежнымі ад грамадзян, а не ад чыноўнікаў з Мінска.

**Незалежнасць судовай улады.** Забяспечыць незалежнасць судоў, выкараніць «тэлефоннае права».

**Гуманізацыя Крымінальнага кодэкса.** Увесці мараторый на смяротнае пакаранне.

**Эфектыўны дзяржаўны апарат.** Аптымізаваць колькасць чыноўнікаў, павысіўшы ім заробкі. Ліквідацыя ідэалагічнай «вертыкалі». Адкрыты конкурс будзе адзінай формай найму на дзяржаўныя пасады.

**Электронны ўрад.** Публікаваць у інтэрнэце бюджэты ўсіх узроўняў, зарплаты службоўцаў, рашэнні судоў, інфармацыю аб тэндарах, конкурсах на дзяржаўныя пасады. Вызваліць грамадзян ад бясконцых даведак, пячатак, ліцэнзій. У новай Беларусі прадпрымальнікі змогуць рэгістраваць бізнес праз інтэрнэт, кожны грамадзянін будзе атрымліваць пашпарт і іншыя дакументы за 15 хвілін.



**Грамадзянская супольнасць.** Стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця некамерцыйных арганізацый, забяспечыць роўны доступ да фінансавання з бюджэту праз удзел у тэндарах і конкурсах нароўні з дзяржаўнымі арганізацыямі.

### САЦЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА: КЛОПАТ ПРА ЛЮДЗЕЙ

*Галоўным прынцыпам сацыяльнай палітыкі павінен стаць прынцып роўных магчымасцяў, заснаваны на салідарнасці моцных і слабых.*

**Медыцына.** Забяспечыць доступ для ўсіх грамадзян да бясплатнага якаснага медыцынскага абслугоўвання ў дзяржаўных медыцынскіх установах пры паралельным развіцці сістэмы страхавой і прыватнай медыцыны. Прыняць закон аб абароне правоў пацыента.

**Адукацыя.** Павялічыць інвестыцыі ў адукацыю і накіраваць іх на павелічэнне заробкаў выкладчыкаў і абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы школ і універсітэтаў. Забяспечыць пераемнасць розных узроўняў адукацыі, звязаць іх з рынкам працы. Вызваліць настаўнікаў ад лішняй адміністрацыйнай і ідэалагічнай нагрузкі. Размеркаванне павінна быць па жаданні. Адмяніць плату за вучобу ў дзяржаўных навучальных установах як з'яву, якая супярэчыць Канстытуцыі.

**Пенсійнае забеспячэнне.** Правесці пенсійную рэформу без павышэння пенсійнага ўзросту. Распрацаваць сістэму накапляльных пенсій, дадатковага пенсійнага страхавання, развіваць прыватныя пенсійныя фонды разам з дзяржаўнымі.

**Адрасная дапамога.** Распрацаваць эфектыўную сістэму адрасных грашовых выплат: шматдзетным сем'ям, беспрацоўным, грамадзянам з абмежаванымі магчымасцямі, у тым ліку на праезд у грамадскім транспарце і камунальныя плацяжы. Пашырыць удзел грамадскіх арганізацый у сацыяльнай дапамозе насельніцтву праз дзяржаўную замову.

**Рэформа працоўных адносін.** Перагледзець кантрактную сістэму найму на работу, адмяніць «дэкрэт аб дармаедах». Аказаць дапамогу ў набыцці новай спецыяльнасці і ў адкрыцці ўласнай справы.

**Дапамога сем'ям.** Садзейнічаць прадпрымальніцкай дзейнасці сем'яў. Падтрымаць будаўніцтва жылля ў рэгіёнах для маладых сем'яў і маладых спецыялістаў, у першую чаргу — індывідуальных жылых дамоў на ўласным зямельным участку.

**Партнёрства дзяржавы і бізнесу.** Распрацаваць сістэму падтрымкі сацыяльна адказнага бізнесу, стымуляваць інвестыцыі работадаўцаў у сістэму сацыяльнай абароны работнікаў свайго прадпрыемства. Увесці падатковыя льготы за спонсарскую падтрымку сацыяльных праектаў.

### ЭКАНАМІЧНАЕ АБНАЎЛЕННЕ

*Асновай павышэння ўзроўню і якасці жыцця грамадзян можа стаць толькі эфектыўная эканоміка, якая развіваецца на аснове прынцыпаў і падыходаў, ужо рэалізаваных у паспяховых краінах.*

**Дзяржаўныя фінансы.** Умацаваць самастойнасць Нацыянальнага банка, дамагчыся стабільнасці валюты і абароны ўкладаў, утаймаваць рост цэн, зрабіць больш даступнымі банкаўскія крэдыты для рэальнага сектара эканомікі, спыніць растрату дзяржаўных сродкаў па запытах галіновых лабістаў.

**Прыцягванне інвестыцый і развіццё бізнес-асяроддзя.** Забяспечыць стабільнасць, празрыстасць сістэмы падаткаабкладання, пашыраць прымяненне спрошчанага падаткаабкладання. Прыняць Інвестыцыйны кодэкс. Адмяніць канфіскацыйныя меры ў дачыненні да бізнесу, правесці дэкрымінізацыю эканамічных злачынстваў.

**Мадэрнізацыя заводаў і прадпрыемстваў.** Стварыць антыкрызісныя праграмы для праблемных заводаў, прыцягнуць пад іх інвестыцыі. Прыватызаваць нежыццяздольныя прадпрыемствы. Гарантаваць тым, хто трапіў пад скарачэнне, атрыманне новай прафесіі, забеспячэнне льготным крэдытам для адкрыцця сваёй справы або сацыяльнай падтрымкай у памеры 2/3 ад заробку на працягу шасці месяцаў.

**Развіццё інавацыйных сектараў эканомікі.** Стварыць асяроддзе для развіцця канкурэнтаздольных галін — інфармацыйных тэхналогій, экалагічнага турызму, транзіту і лагістыкі, ваеннапрамысловага комплексу, альтэрнатыўнай энергетыкі, інжынірынгу, банкаўскіх паслуг.

**Развіццё канкурэнцыі.** Забяспечыць роўную канкурэнцыю прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці, што пацягне зніжэнне цэн на тавары і паслугі.

**Стварэнне рабочых месцаў у рэгіёнах.** Зацвярджэнне сістэмы падатковых і адміністрацыйных прэферэнцый для адкрыцця і вядзення бізнесу ў малых і сярэдніх гарадах. Рэалізацыя палажэнняў «Нацыянальнай платформы бізнесу Беларусі» Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва.

**Развіццё энергетычнага сектара.** Укараніць энергазберагальныя тэхналогіі і развіваць выкарыстанне аднаўляльных крыніц энергіі.

**Сельская гаспадарка.** Рэфармаваць на аснове шматукладнасці, свабоднага развіцця ўсіх формаў уласнасці і стварэння рынку зямлі, падтрымаць развіццё фермерскіх гаспадарак.

**Развіццё навукі.** Аднавіць страчаныя пазіцыі праз стымуляванне ўцягнутасці ў сусветную навуковую кааперацыю і аказанне мэтавай дзяржаўнай падтрымкі эфектыўным распрацоўкам, прыцягнуць да падтрымкі даследаванняў зацікаўленыя прыватныя структуры.

**Свабодны фінансавы рынак.** Выпусціць у свабоднае абарачэнне акцыі. Стварыць новыя магчымасці зберажэнняў, крэдытавання, інвестыцый для грамадзян і прадпрыемстваў, садзейнічаць зніжэнню крэдытнай працэнтнай стаўкі.

**Развіццё малых і сярэдніх гарадоў.** Стымуляваць стварэнне новых заводаў і прадпрыемстваў у рэгіёнах. Павышэнне ўзроўню даходаў і развіццё іпатэкі павінны дазволіць сем'ям набываць уласнае жыллё ў сярэднім за пяць-шэсць гадоў.

### ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА. МІРНАЯ БЕЛАРУСЬ: АДКАЗНАЕ СУСЕДСТВА І СУВЕРЭНІТЭТ

*Беларусь павінна будаваць раўнапраўныя і ўзаемавыгадныя адносіны як са сваімі суседзямі, так і з астатнімі краінамі свету. Знешняя палітыка павінна грунтавацца на нацыянальных інтарэсах і спрыяць міру і бяспецы ў нашым рэгіёне.*

**Сапраўдны нейтралітэт.** Рэалізаваць палажэнне Канстытуцыі пра «імкненне Беларусі да нейтральнага статусу». Беларусь не будзе ўваходзіць ні ў якія ваенныя блокі, якія могуць уцягнуць яе ва ўзброены канфлікт.

**Адказнае суседства.** Выбудоўваць добрыя і ўзаемавыгадныя адносіны як з Захадам, так і з Усходам, няўхільна выконваючы ўзятыя на сябе міжнародныя абавязацельствы і патрабуючы гэтага ад нашых партнёраў. Дамагчыся бязвізавага рэжыму з большасцю краін свету.

**Рэгіянальная бяспека.** Садзейнічаць міру і бяспецы ў рэгіёне. Умацоўваць і мадэрнізаваць нашы ўзброеныя сілы.

### АДРАДЖЭННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ ЯК АСНОВА БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

*Беларусь не стане стабільнай дзяржавай, калі не будзе абапірацца на гістарычныя і культурныя традыцыі беларускага народа. Улада будзе адраджаць беларускую культуру і ўмацоўваць нацыянальную самасвядомасць як аснову беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай бяспекі.*

**Прыярытэтная падтрымка сферы культуры.** Устанавіць падатковыя льготы і стварыць умовы для свабоднай рэалізацыі ініцыятыў грамадзянскай супольнасці і бізнесу, накіраваных на развіццё беларускай культуры, мовы і нацыянальных каштоўнасцяў.

**Падтрымка беларускай мовы.** Прыняць закон аб дзяржаўнай падтрымцы беларускай мовы, адкрыць Нацыянальны ўніверсітэт, а ў кожным райцэнтры — школу або гімназію з выкладаннем усіх прадметаў на беларускай мове. Чыноўнік, дэпутат, кіраўнік дзяржавы абавязаны валодаць дзвюма дзяржаўнымі мовамі.

**Свабода слова і друку.** Зняць існуючыя бар'еры для свабоднай дзейнасці СМІ і журналістаў.

**Свабода веравызнання і павага да годнасці асобы.** Забяспечыць раўнапраўе ўсіх канфесій і нацыянальна-культурных меншасцяў.

# БЕЛАРУСЬ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ. Я ЗРАБЛЮ!

## Праграма кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Ганны КАНАПАЦКАЙ

Мае суайчыннікі, сёстры і браты!

Неўзабаве, кожнаму з вас трэба будзе абіраць будучыню нашай краіны, будучыню сваю, сваіх дзяцей і ўнукаў, будучыню Беларусі.

Ад выбару кожнага з вас залежыць вельмі шмат.

Па сутнасці, перад краінай зараз — усяго два шляхі. Адзін шлях — да вымірання і дэградацыі, самаізаляцыі ды атачэння сябе «колам ворагаў». Гэтым шляхам паслядоўна ідзе сённяшняя ўлада. Другі шлях — гэта шлях адзінства і згоды, развіцця і прагрэсу, шлях у сям'ю еўрапейскіх народаў. Гэта шлях міру і стваральніцтва. Я — за другі шлях.

Нам неабходна ў першую чаргу спыніць імклівае падзенне нашай краіны ў сацыяльную і эканамічную прорву. Трэба аднавіць тое шматлікае, што згублена за чвэрць стагоддзя кіравання цяперашняй улады.

Мы згубілі больш за мільён нашых суграмадзян, апынуліся ў дэмаграфічнай яме, цалкам згубілі свой аўтарытэт у свеце і сярод суседзяў. Мы маем адсталую прамысловасць, неэфектыўную сельскую гаспадарку, велізэзны знешні доўг, агромністыя адміністрацыйны і рэпрэсіўны апараты, беднае насельніцтва і аўтарытарнага лідара на чале краіны.

Нашы дзяржаўнасць і незалежнасць знаходзяцца пад пагрозай і з'яўляюцца прадметам пастаяннага гандлю.

Таму, перш за ўсё, мы павінны абараніць тое, што яшчэ засталося, і вярнуць тое, што ў нас адабралі.

І ў першую чаргу мы павінны захаваць і вярнуць нашых людзей. Бо нашы людзі — гэта самае каштоўнае багацце Беларусі!

Мая праграма — **«БЕЛАРУСЬ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ. Я ЗРАБЛЮ!»**

Яна пабудавана на базавых прынцыпах дэмакратычнай, еўрапейскай, суверэннай, сацыяльнай дзяржавы. Дзяржавы для народа і для кожнага чалавека, які ў ёй жыве.

### НЕЗАЛЕЖНАЯ БЕЛАРУСЬ

Шляхам трывання і шматвекавой барацьбы наш народ здабыў сваю дзяржаўнасць і незалежнасць. Шлях быў цяжкі, але мы гэта зрабілі. І мы заўсёды абаронім Айчыну ад любых замахаў. Нашы дзеці, унукі і праўнукі будуць вольна жыць на сваёй зямлі. Яны самі будуць вырашаць свой лёс.

### БЕЛАРУСЬ — ЕЎРАПЕЙСКАЯ КРАІНА

Толькі і выключна нацыянальныя інтарэсы павінны быць асновай знешняй палітыкі. Беларусь з'яўляецца неад'емнай часткай еўрапейскай цывілізацыі. Таму еўрапейскі шлях нашай краіны — гэта не пытанне геапалітычнага хістання паміж Масквой і Бруселем, а свядомы і асэнсаваны ўдзел у еўрапейскіх структурах у якасці паўнапраўнага зацікаўленага боку.

Я выступаю за рэалізацыю закладзенага ў Канстытуцыі імкнення да дзяржаўнага нейтралітэту і за перагляд усіх міжнародных дагавораў, якія не адпавядаюць нацыянальным інтарэсам Беларусі:

— дэнансацыю Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы;

— выхад з Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ);

— спыненне дагавораў арэнды вайсковых аб'ектаў на тэрыторыі Беларусі Расійскай Федэрацыяй і вывад з тэрыторыі Беларусі расійскіх вайскоўцаў.




### НАРОД БЕЛАРУСІ І КОЖНЫ ЯЕ ГРАМАДЗЯНІН ЗАЎСЁДЫ БУДЗЕ СВАБОДНЫМ

У гэтым я бачу адну з найважнейшых сваіх задач.

Я цвёрда перакanaна ў неабходнасці замацавання і выканання дзяржавай палітычных і прававых нормаў, якія вызначаюць правы і свабоды чалавека, грамадзяніна дэмакратычнай Беларусі, такіх як свабода асобы, свабода выбару, свабода сумлення, свабода веравызнання.

Толькі свабодны чалавек здольны на эфектыўную, плённую і стваральную працу. Менавіта такі чалавек можа быць часткаю моцнай сям'і, вольнага народа і моцнай дзяржавы.

### ПРАЦА І ДАБРАБЫТ

Даць магчымасць кожнаму чалавеку зарабляць на дастойнае жыццё сваёй працай — гэты прынцып будзе закладзены ў фундамент беларускай эканамічнай мадэлі. Рэфармаваць і мадэрнізаваць эканоміку, захаваць эфектыўныя прадпрыемствы, развіць тэхналагічныя галіны, стварыць новыя рабочыя месцы для людзей — гэта тое, чым я займуся ў найбліжэйшы час.

### САЦЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА І ДЭМАГРАФІЯ

Гэта найважнейшая пазіцыя ў маіх пераўтварэннях на пасадзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Як жанчына і як маці я прайшла нялёгкі шлях і ўяўляю сабе, што трэба рабіць.

Для вырашэння задачы росту колькасці насельніцтва нашай краіны я зраблю наступныя крокі:

— фундаментальныя мерапрыемствы па ўзмацненні сацыяльнага забеспячэння мацярынства і дзяцінства;

— рэалізацыя праграм па стымуляванні нараджэння дзяцей, стварэння і ўмацавання маладых сем'яў, забеспячэнні дадатковых сацыяльных гарантый такім сем'ям;

— істотная змена і заканадаўчае замацаванне механізму выдзялення мацярынскага капіталу і пашырэнне катэгорый асоб, якія маюць права на яго атрыманне;

— зніжэнне заканадаўча дазволенага ўзросту ўступлення ў шлюб для жанчын да 17 гадоў са згоды бацькоў;

— увядзенне для мужчын, якія маюць малалетніх дзяцей, адтэрміноўкі ад службы ва Узброеных Сілах Беларусі на перыяд да дасягнення дзецьмі 5-гадовага ўзросту;

— павелічэнне прызыўнога ўзросту для праходжання тэрміновай ваеннай службы для мужчын да 20 гадоў з паслядоўным пераходам да прафесійнай арміі;

— істотныя змены сацыяльнай палітыкі па падтрымцы няпоўных сем'яў, якія маюць дзяцей;

— легалізацыя і забеспячэнне заканадаўчых гарантый і свабод сем'ям, якія знаходзяцца ў фактычным, але не зарэгістраваным у дзяржаўных органах шлюбе;

— заканадаўчае замацаванне інстытута сурагатнага мацярынства;

— частковая рэформа сістэмы аховы здароўя, скіраваная на павышэнне даступнасці бясплатнага медыцынскага абслугоўвання для малазабяспечаных катэгорый грамадзян;

— пенсійная рэформа з забеспячэннем ільгот пенсіянерам, якія працуюць, выключэннем іх падаткаабкладання, захаваннем за сужэнцамі-пенсіянерамі права на пажыццёвае атрыманне пенсіі другога ў выпадку смерці аднаго з іх.

### БЯСПЕКА І ПАРАДАК

Дэмаграфічны рост і вырашэнне сацыяльных задач немагчымыя без забеспячэння бяспекі і парадку ў краіне.

Дзеля гэтага мною будзе рэалізаваны комплексны план мерапрыемстваў, якія паспрыяюць:

— ўцягненню насельніцтва і выкарыстанню перадавых тэхналогій у забеспячэнне грамадскай бяспекі;

— ўмацаванню сувязі праваахоўных органаў з грамадзянскай супольнасцю;

— забароне на выкарыстанне праваахоўных органаў у палітычных мэтах і для барацьбы з іншадумствам;

— падняццю прэстыжу органаў аховы парадку і барацьбы са злачыннасцю.

### ЦЫВІЛІЗАВАНАЯ ЗМЕНА ЎЛАДЫ І ЯЕ РЭФАРМАВАННЕ

Я выступаю за бяскроўны, цывілізаваны, дэмакратычны пераход улады ў нашай краіне. Дзеля гэтага я прапаную заканадаўча замацаваць:

— абмежаванне адным сямігадовым тэрмінам знаходжанне на пасадзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

— забеспячэнне спецыяльных гарантый сышоўшаму кіраўніку дзяржавы і членам яго сям'і з асаблівым механізмам прыцягнення яго да судовай адказнасці пры наяўнасці дастатковых падстаў.

За час свайго прэзідэнцтва я буду ініцыяваць рэформы, скіраваныя на змену сістэмы дзяржаўнага кіравання ў форму парламенцка-прэзідэнцкай рэспублікі.

### ЭКАНОМІКА І ІНВЕСТЫЦЫІ

Міф пра ўстойлівасць эканамічнай мадэлі, выбудаванай сучаснымі ўладамі, які насаджаўся дзесяцігоддзямі, разбураецца сёння на вачах. Негатыўныя наступствы правальнай эканамічнай палітыкі відаць усім.

Час для хуткіх і эфектыўных эканамічных змен бяздарна згублены. Зараз даводзіцца ісці на складаныя і рашучыя меры, сярод якіх:

— фундаментальная падатковая рэформа са зменай сістэмы падаткаабкладання — дзеля змяншэння падатковага цяжару і павелічэння эфектыўнасці выкарыстання падатковых адлічэнняў;

— поўны перагляд дзяржаўнай крэдытна-фінансавай і бюджэтнай палітыкі;

— прыватызацыя пэўных дзяржаўных прадпрыемстваў;

— закрыццё неэфектыўных вытворчасцяў з перапразмеркаваннем і сацыяльным забеспячэннем працоўных рэсурсаў;

— увядзенне інстытута прыватнай уласнасці на зямлю;

— уцягненне зямель у гаспадарчы і фінансавы абарот (з абмежаваннямі па пэўных катэгорыях ворных зямель, якія застануцца ва ўласнасці дзяржавы дзеля забеспячэння харчовай бяспекі);

— разбуйненне сельскагаспадарчых прадпрыемстваў з ліквідацыяй наступстваў сацыялістычнай калектывізацыі;

— замацаваная заканадаўствам амністыя капіталу;

— узмацненне барацьбы з карупцыяй;

— нацыяналізацыя незаконна набытых актываў і вяртанне грашовых сродкаў, што былі выведзеныя з краіны;

— забеспячэнне шматузроўневых ільгот для развіцця малога бізнесу і нацыянальнага капіталу.

Пасля прыняцця гэтых першачарговых захадаў можна будзе разлічваць на прыцягненне істотных унутраных і замежных інвестыцый.

Вырашэнне эканамічных задач дазволіць нам пачаць рэальна, а не на словах, развіваць Беларусь як сацыяльную дзяржаву.

### СУДОВАЯ РЭФОРМА

Без поўнамаштабнай судовай рэформы, мэта якой — забеспячэнне незалежнасці судовай улады ад выканаўчай і заканадаўчай, аднаўленне даверу да судовай сістэмы і павышэнне прафесіяналізму суддзяў, не будзе магчымасці дасягнуць тых мэт, якія я стаўлю перад сабою на перыяд прэзідэнцтва. Яна будзе праведзена ў самыя кароткія тэрміны.

### НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СІМВАЛЫ

Незалежнасць Беларусі не будзе трывалай да таго часу, пакуль яна не забяспечваецца культурнымі, ідэалагічнымі і юрыдычнымі чыннікамі. Дзеля іх стварэння я буду ініцыяваць:

— вяртанне дзяржаўнага статусу спрадвечным нацыянальным беларускім сімвалам — гербу «Пагоня» і Бела-Чырвона-Беламу сцягу;

— абвяшчэнне галоўным дзяржаўным святам краіны Дня Волі 25 сакавіка;

— уключэнне ў сістэму дзяржаўных святаў найважнейшых для нашай незалежнасці дат — 27 ліпеня і 25 жніўня;

— увядзенне крымінальнай адказнасці за любыя публічныя выказванні, што аспрэчваюць або адмаўляюць існаванне асобнай беларускай нацыі і/або яе гістарычнага права на стварэнне ўласнай дзяржавы.

### САЦЫЯЛЬНАЯ ДЗЯРЖАВА

Дзеля дасягнення самых высокіх сацыяльных стандартаў жыцця нашых грамадзян будуць скіраваныя ўсе мае эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні. Я ведаю, як зрабіць, каб Беларусь перастала быць краінай уцёкаў моладзі і нуды старэйшага пакалення. Наша краіна вартая таго, каб стаць прыцягальнай для жыцця грамадзян любога ўзросту. У нас для гэтага ёсць усё — трэба толькі правільна гэта скарыстаць.

Дэмакратычная, сацыяльна і эканамічна развітая, з насельніцтвам, якое расце, Беларусь — галоўная мэта ўсёй маёй палітычнай дзейнасці. Каб яе споўніць, у мяне ёсць усё — воля, моц, упэўненасць у сваёй праўдзе, прафесійная каманда і час.

Мне патрэбная толькі ваша падтрымка. Разам мы зможам пабудаваць шчаслівую і квітнеючую краіну!

### БЕЛАРУСЬ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ. Я ЗРАБЛЮ!

# КРАІНА ДЛЯ ЖЫЦЦЯ. КРАІНА ДЛЯ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ

## Перадвыбарчая праграма кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Святланы ЦІХАНОЎСКАЙ

Я — кандыдат у Прэзідэнты Святлана Ціханоўская, і гэта маё пісьмо ўсім грамадзянам Беларусі. Мне 38 гадоў. Нарадзілася на Палессі. Скончыла філалагічны факультэт Мазырскага педагагічнага ўніверсітэта. Свабодна валодаю беларускай, рускай і англійскай мовамі.

Год таму мой муж Сяргей Ціханоўскі стварыў свой праект «Краіна для жыцця» і паехаў па Беларусі. Сяргей даў людзям магчымасць выказацца. Яны расказвалі, што іх турбуе, што яны адчуваюць, што думаюць пра Беларусь. Людзі казалі пра сваё няпростае жыццё і марылі пра жыццё ў свабоднай і багатай краіне.

Мяне ўразіла тое, як улада гэтага спалохалася. Людзям пачалі пагражаць, звальняць з работы, кідаць у турмы. Аказалася, што магчымасць выказацца можа абудзіць грамадства.

Калі Сяргея пазбавілі магчымасці ўдзельнічаць у выбарах, несправядліва абвінавацілі і арыштавалі яго, я вырашыла замяніць яго і ісці да перамогі. За сябе, за мужа, за ўсіх нас, за нашых дзяцей. Як жонка, як маці я разумею, што ў сям'і адзін за ўсіх і ўсе за аднаго. Я хачу, каб так было і ў нашай краіне.

Заяўляю: я хачу стаць Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, але не дзеля пасады, а для таго, каб вярнуць вам права выбару.

Мы будуем краіну не толькі для сябе, але і для нашых дзяцей.

Я хачу, каб нашы дзеці атрымлівалі добрую адукацыю, медабслугоўванне, каб яны маглі мець добрую работу, ствараць сям'ю і мець сваё жыллё. Каб яны засталіся жыць тут, на сваёй зямлі, а не хацелі з'ехаць у пошуках больш свабоднай і справядлівай краіны.

Я хачу, каб мы адчувалі любоў і павагу да сябе, мелі права выбару і ганарыліся сваёй краінай для жыцця.

Я хачу, каб Беларусь паважалі ў свеце, каб мы шукалі сяброў, а не ворагаў.

Я хачу, каб сышла ў мінулае подлая традыцыя пераследаваць людзей за праўду.

Паўтараю, я прыйшла ў палітыку не дзеля ўлады, а дзеля аднаўлення справядлівасці. Мая галоўная мэта — правесці сапраўдныя сумленныя выбары з удзелам усіх альтэрнатыўных кандыдатаў. **Галасуючы за мяне, вы галасуеце за аднаўленне вашага права выбіраць уладу, за новыя і сумленныя выбары.** Толькі так краіна зможа развівацца далей.

Мы аб'ядналіся з камандамі Віктара Бабарыкі і Валерыя Цапкалы, з намі супрацоўнічаюць найлепшыя эксперты, партыі і грамадскія арганізацыі. Мы стварылі моцную каманду дзеля агульнай мэты — будаваць новую Беларусь. Давайце рабіць гэта разам!

**Для перамогі мы з вамі, дарагія суграмадзяне, павінны дзейнічаць як адна вялікая каманда.**

**Што я прашу зрабіць кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь:**

• ні ў якім разе не ўдзельнічаць у датэрміновым галасаванні, каб ваш голас не скралі, і пераканаць у гэтым сваіх сяброў, суседзяў і знаёмых;

• прыйсці на выбары менавіта 9 жніўня, прагаласаваць за мяне, Святлану Ціханоўскую;

• стаць незалежнымі назіральнікамі на ўчастках і абараняць свой голас. Для гэтага створана шмат ініцыятыў, у якія мы заклікаем вас уступаць: «Сумленныя людзі», «Права выбару», «Рух Праўда», «Зубр» і іншыя.



Для чаго гэта трэба?

1. Даказаць усім, у тым ліку і ўладзе, што нас абсалютная большасць і што мы ніколі не застанемся ўбаку.

2. Сабраць рэкордную ў гісторыі незалежнай Беларусі колькасць назіральнікаў і зафіксаваць рэальны вынік галасавання.

Я заклікаю вас не заставацца дома 9 чысла — інакш вы прагаласуеце за цяперашнюю ўладу, якая ўсім вам надакучыла. Чым большая яўка, тым больш відавочнай будзе фальсіфікацыя. Чым большая яўка, тым цяжэй скрасці ваш голас.

Пасля таго, як стануць вядомымі відавочныя для ўсёй краіны вынікі выбараў 9 жніўня 2020 года, выбар народа павінны будуць паважаць усе. А тым, хто адмовіцца, давядзецца па патрабаванні народа сысці.

### МЕРЫ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ НОВЫХ СУМЛЕННЫХ І СВАБОДНЫХ ВЫБАРАЎ

Ужо сёння зразумела, што выбары, якія адбудуцца 9 жніўня 2020 года, немагчыма прызнаць свабоднымі і сумленнымі. Многіх моцных кандыдатаў, у тым ліку Сяргея Ціханоўскага, Віктара Бабарыку і Валерыя Цапкалу, пазбавілі магчымасці ў іх удзельнічаць: па замове аднаго з канкурэнтаў распачатыя крымінальныя справы, у сметнік выкінутыя сотні тысяч сабраных подпісаў. Патрэбныя новыя сумленныя і свабодныя выбары з празрыстым падлікам галасоў.

Пасля ўступлення на пасаду Прэзідэнта я прыму меры для захавання стабільнасці ў краіне і стварэння ўмоў для правядзення сумленных выбараў:

• я прызначу шэсць новых незалежных членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі, у тым ліку старшыню, і выдам указ аб правядзенні новых выбараў Прэзідэнта;

• сістэма выбарчых камісій будзе сфарміравана такім чынам, што ў іх будуць уключаны прадстаўнікі ўсіх зацікаўленых палітычных партый, розных грамадскіх арганізацый, а таксама, у абавязковым парадку, прадстаўнікі кандыдатаў у Прэзідэнты;

• на кожным участку будуць устаноўлены празрыстыя урны і камеры, якія будуць весці анлайн-трансляцыю;

• кожны бюлетэнь будзе дэманстравацца назіральнікам і толькі пасля гэтага змяшчацца ў стос галасоў за кандыдата;

• давераныя асобы кандыдатаў будуць мець права патрабаваць пераліку галасоў за любога кандыдата на любым участку;

• датэрміновае галасаванне будзе дапускацца ў выключных выпадках для тых, хто не можа галасаваць у дзень выбараў па ўважлівай прычыне;

• усім кандыдатам будуць дадзены роўныя магчымасці для агітацыі, без злоўжывання службовым становішчам.

Пасля маёй перамогі на выбарах на працягу пераходнага перыяду краінай будуць кіраваць тыя ж чыноўнікі, што і цяпер, за выключэннем тых, хто груба і адкрыта парушаў закон. Тых, хто сыдзе ў адстаўку, заменяць прафесіяналы з ліку дзяржаўных служачых. Новыя прэзідэнцкія выбары будуць праведзены на працягу паўгода.

Я прызначу правядзенне рэферэндуму з прапановай вярнуцца да першапачатковай рэдакцыі Канстытуцыі 1994 года, якая скарачае паўнамоцтвы прэзідэнта, устанаўлівае абмежаванне на колькасць тэрмінаў знаходжання на пасадзе і забяспечвае падзел улад. Рэферэндум будзе праводзіцца адначасова з выбарамі прэзідэнта.

Я аднаўлю законнасць у сферы крымінальнага і адміністрацыйнага працэсу. Справы ў дачыненні да палітвязняў будуць спынены. Правядзём амністыю для тых, хто ўпершыню ўчыніў няцяжкія злачынствы, у тым ліку для дзяцей, асуджаных па артыкуле 328. Усе неправасудныя прыгаворы і пастановы за перыяд выбарчай кампаніі будуць адменены з вяртаннем выплачаных штрафаў і выплатай кампенсацый пацярпелым. Для забеспячэння наглядных функцый на пераходны перыяд мною будуць прызначаны новы генеральны пракурор і новы старшыня Вярхоўнага суда.

Мая праграма — гэта мой погляд на тое, якой павінна стаць наша краіна. Я ўпэўнена, што гэтага ж хоча большасць нашых грамадзян, і таму разлічваю на вашу падтрымку і ваш удзел.

### КРАІНА ДЛЯ ЖЫЦЦЯ, ДЗЯРЖАВА ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

Па Канстытуцыі ўлада належыць народу, а на справе — чыноўнікам, якія даўно забыліся пра інтарэсы людзей.

Цяпер дэпутаты не выбіраюцца, а прызначаюцца. Суды адпраўляюць невінаватых у турмы, дамагчыся справядлівасці амаль немагчыма. Трэба вярнуць краіну людзям.

Кіраўнікі ўсіх узроўняў павінны паважаць людзей, памятаючы, што займаюць свае пасады толькі таму, што людзі ім гэта дазволілі. Праваахоўныя органы павінны абараняць людзей, а не хапаць мірных грамадзян на вуліцы і ў чэргах. Яны павінны змагацца са злачыннасцю і карупцыяй, прадухіляць гвалт у сям'і.

### ПАВЫШЭННЕ ЎЗРОЎНЮ ЖЫЦЦЯ

Галоўнае багацце нашай краіны — яе людзі. Трэба даць ім магчымасць працаваць і зарабляць. Сёння многія працуюць на стратных прадпрыемствах, а сотні тысяч, калі не мільён, — за мяжой. Трэба ствараць рабочыя месцы ў Беларусі.

Мы здымем бар'еры для развіцця малога і сярэдняга бізнесу. Няхай людзі самі ствараюць рабочыя месцы. Прыбытковыя дзяржаўныя прадпрыемствы працягнуць працаваць. Са стратнымі павінны разабрацца прафесіяналы.

У краіне ёсць прафесійныя эканамісты і менеджары, якія здолеюць павысіць узровень жыцця і скараціць непатрэбныя дзяржаўныя выдаткі.

### ЗДАРОЎЕ ЛЮДЗЕЙ

У нас ёсць выдатныя высокаадукаваныя медыкі, але сітуацыя з эпідэміяй COVID-19 паказала, што ім перашкаджаюць працаваць чыноўнікі, якія клапат аб статыстыцы ставяць вышэй, чым здароўе людзей.

Каб і ўрачы былі задаволеныя высокай зарплатай, і людзі клопатам аб іх здароўі, патрэбна сістэма, калі грошы за лячэнне, няхай гэта будзе з дзяржаўнага бюджэту ці з добраахвотных страхавых узносаў, ішлі за пацыентам у медыцынскія ўстановы, як дзяржаўныя, так і недзяржаўныя. Тады будуць павышацца і якасць медыцыны, і зарплаты ўрачоў, якія добра працуюць.

Інфармацыя аб грамадскім здароўі павінна быць праўдзівая і агульнадаступная.

### АДУКАЦЫЯ

Настаўнікаў у школах трэба вызваліць ад усяго, што не звязана з навучаннем і выхаваннем дзяцей, — ад забеспячэння падпіскі на газеты, прымусу дзяцей уступаць у БРСМ, наведвання прапагандысцкіх мерапрыемстваў — да збору грошай і рамонту кабінетаў за свой кошт.

Праца настаўніка павінна аплачвацца годна. Школа павінна развіваць асобу, уменне шукаць інфармацыю, працаваць у камандзе, нараджаць і шанаваць новыя ідэі. Эфектыўнай эканоміцы патрэбныя творчыя асобы, крэатыўныя і таленавітыя, а гэта значыць — свабодныя.

Школа зменіцца да лепшага, калі апроч дзяржаўнай будзе развівацца і прыватная сістэма адукацыі — гэта створыць здаровую канкурэнцыю.

Універсітэты пяройдуць на самакіраванне. Трэба адмяніць прымусовае размеркаванне і «закон Раўкова», па якім студэнтаў забіраюць у армію, не даўшы скончыць адукацыю.

### ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА

Незалежнасць — наша абсалютная каштоўнасць, мы яе не прадаём, не гандлюем, не абмяркоўваем.

Мы мірныя людзі і будзем сябраваць з усімі, але толькі ў інтарэсах уласнай краіны.

Мы павінны стварыць партнёрства на роўных, а не залежнасць ад газавай або крэдытнай «іголкі».

Нас усіх чакае вялікая праца. За 26 гадоў краіна прыйшла да той кропкі, калі праблему нельга вырашыць у адзін момант. Простага шляху няма. Або мы аб'ядноўваемся і разам ідзём далей у краіну для жыцця, або зноў паўтараем памылкі мінулых гадоў.

Прыйшоў час перамен. Ніхто не можа распараджацца народам, ніхто не можа валодаць ім, ніхто не можа закрыць яму рот. Беларускі народ прачнуўся!

Галасуйце за новыя выбары і абараняйце свой голас.

Толькі разам мы зможам пабудаваць краіну для жыцця!

На кантролі

# ВЫКАНАНА!

## На Гомельшчыне мадэрнізавана вытворчасць па атрыманні мяса птушкі «Беларуснафта-Асобіна»

**«Беларуснафта-Асобіна» — адно з валаўтваральных прадпрыемстваў у Гомельскай вобласці па вытворчасці птушкі. Яно працуе па прынцыпе замкнутага цыкла, займаецца вырошчваннем збожжа і рапсу, уваходзіць у пяцёрку найбуйнейшых вытворцаў мяса птушкі ў краіне.**



Год таму Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас рабочай паездкі ў Веткаўскі раён падняў пытанне далейшага развіцця птушкагадоўлі на Гомельшчыне. Кіраўнік краіны наведаў вытворчы цэх «Навасёлкі» птушкафабрыкі прадпрыемства «Беларуснафта-Асобіна». Ён зрабіў акцэнт на тым, што неабходна нарошчваць магутнасці па вытворчасці мяса птушкі. Па даручэнні Прэзідэнта прадпрыемства «Беларуснафта-Асобіна» распачало маштабнае абнаўленне вытворчых пляцовак. Было прынята рашэнне павялічыць магутнасці па вытворчасці мяса птушкі за кошт мадэрнізацыі цэха ў аграгарадку Камунар, што ў Буда-Кашалёўскім раёне.

Будаўнічыя работы пачаліся сёлета ў лютым. Удалося ўдвая скарацiць тэрміны ўзвядзення аб'екта: пры нарматыве ў 12 месяцаў птушнікі збудавалі за 6 месяцаў.

Праект рэалізаваны па дзяржаўнай праграме развіцця аграрнага бізнесу ў Беларусі на 2016—2020 гады. Аб'ём інвестыцый склаў 6,4 мільёна рублёў.

Новая вытворчасць — гэта чатыры птушнікі, у якіх адначасова можна вырошчваць каля 50 тысяч бройлераў. Гэта амаль удвая больш, чым было раней. Адпаведна ў два разы павялічыцца і аб'ём атрыманага мяса. Таму, безумоўна, на прадпрыемстве прапрацоўваліся ўсе магчымыя рынкі збыту. Асаблівая ўвага на экспарт прадукцыі.

— Буйнымі спажыўцамі беларускай птушкі з'яўляюцца прадстаўнікі расійскага рынку, — адзначыў **дырэктар РУП «Беларуснафта-Асобіна» Яўген ЛУКОМСКІ**. — Акрамя таго, мы працуем з Арменіяй, Грузіяй, Кыргызстанам, Казахстанам. На пачатку бягучага года распачалі супрацоўніцтва з КНР. Адбыліся чатыры адгрузкі прадукцыі. Асноўны прадукт, які цікавіць нашых кітайскіх партнёраў, — гэта курыныя лапкі і часткі крыла. Сёння мы прапрацоўваем пытанне, каб на кітайскі рынак накіроўваць прадукцыю разбірання мяса птушкі ў большых аб'ёмах.

У мадэрнізаваных птушніках прадугледжана клетачнае ўтрыманне бройлераў. Перавага такога падыходу ў тым, што на невялікай плошчы вырошчваецца значная колькасць птушкі.

— Старыя памяшканні прадугледжвалі падлогавае ўтрыманне птушкі і мясцілі 24 тысячы бройлераў, — дадаў Яўген Лукомскі. — У сучасных размесціцца прыкладна ўдвая больш.

У новых клетках, якія размешчаны ў некалькі ярусаў, падтрымліваецца неабходны для птушкі мікраклімат. Камп'ютарныя тэхналогіі кантралююць вільготнасць, тэмпературу і аб'ём корму. Для куранят рознага ўзросту ствараюцца аптымальныя ўмовы.

— Працую тут з 1976 года. Параўноўваць сённяшнія ўмовы і тое, што было раней, немагчыма, — дзеліцца **птушніца-аператар бройлернага цэха Ганна БАРЭЙША**. — Цяпер усё аўтаматызавана: кнопку націснуў — і працуе. Птушкам камфортна, растуць.

Паказчык па сярэднясутачнай прыбаўцы вагі складае больш як 60 грамаў. І прадукцыйнасць расце. Пра такія вынікі калісьці і марыць не маглі, кажа ветэран працы Ганна Барэйша. Яна ўспамінае, як у 1982 годзе была ўзнагароджана залатым медалём ВДНГ за дасягненне сярэднясутачнай прыбаўкі ў 28 грамаў.

Між тым сёння РУП «Беларуснафта-Асобіна» — прызнаны прыклад паспяховай кааперацыі сельгаспрадпрыемства і дзяржаўнай кампаніі. З 2005 года аб'ём вытворчасці мяса птушкі тут вырас у пяць разоў.

**Генеральны дырэктар ВА «Беларуснафта» Аляксандр ЛЯХАЎ** адзначыў, што перадача ў пачатку 2000-х сельскагаспадарчага прадпрыемства нафтавікам стала своеасаблівым выклікам для іх:

— Для нас гэта была зусім новая сфера. Вынікі 15 мінулых гадоў паказалі, што рашэнне прынята правільнае. Мы выйшлі на завяршальны этап рэканструкцыі для збалансаванага цыкла вытворчасці. Узаемадзеянне прадпрыемства, сельскай гаспадаркі і органаў улады аказалася вельмі эфектыўным. Мы разам гэта зрабілі, усё атрымалася, — падкрэсліў Аляксандр Ляхаў.

У цырымоніі адкрыцця мадэрнізаваных птушнікаў брала ўдзел **памочнік Прэзідэнта, інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ШУЛЕЙКА і старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.**

Губернатар падзякаваў нафтавікам, работнікам сельскай гаспадаркі і будаўнікам за годны аб'ект:

— Інвестыцыі ў сельскую гаспадарку — гэта развіццё раёнаў і Гомельскай вобласці ў цэлым, новыя рабочыя месцы, годны заробак, перадавыя тэхналогіі і рэнтабельнасць вытворчасці, — адзначыў ён.

Генадзь Салавей пакінуў запіс у кнізе ганаровых гасцей прадпрыемства «Беларуснафта-Асобіна» і пагутарыў з працаўнікамі вытворчасці. Людзі цікавіліся падтрымкай шматдзетных сем'яў і развіццём сацыяльнай сферы не толькі канкрэтна ў аграгарадку Камунар, але і ў Буда-Кашалёўскім раёне ўвогуле. Старшыня аблвыканкама звярнуў увагу на канкрэтныя праекты і запэўніў, што робіцца ўсё магчымае, каб жыць і працаваць у раёне людзям было камфортна:

— Перад намі стаіць задача нарошчваць аб'ёмы вытворчасці. Так, былі згубленыя пэўныя пазіцыі. Але на сённяшні дзень наша мэта, каб раён зноў быў у лідарах. Цяпер на базе СУП «Андрэеўка» на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна рэалізуецца новы праект па будаўніцтве свінагадоўчага комплексу. Узмацненне вытворчых пазіцый важнае для таго, каб падняць заработную плату і падтрымаць работнікаў сельскай гаспадаркі, — адзначыў Генадзь Салавей.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**

---

Надвор'е

# ТЫДЗЕНЬ ЦЯПЛА

**Мінулыя выхадныя былі даволі прахалодныя. Паветра, якое паступала да нас са Скандынавіі, прагравалася недастаткова — сярэдняя тэмпература за першыя два дні жніўня выдалася на 1—5 градусаў ніжэйшая за кліматычную норму. Але сітуацыя пачынае выпраўляцца. Вятры з Цэнтральнай Еўропы вернуць нам летняе надвор'е, а па поўдні краіны будзе нават спякотна. Падрабязней пра тое, чаго нам чакаць ад першага тыдня жніўня, расказалі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння па краіне чакаецца надвор'е пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па заходніх раёнах пройдуць непрацяглыя навальнічныя дажджы. Вецер будзе паўднёвы, днём парывісты. Паветра прагрэецца добра — ад 24 да 29 градусаў, месцамі па Брэсцкай вобласці аж да 32 вышэй за нуль.

У сераду надвор'е крыху сапсуецца. Атмасферны фронт будзе пакрысе перасоўвацца з Польшчы на ўсход. Таму ўначы па захадзе краіны, а ўдзень і ў цэнтры чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы тэрмометры пакажуць ад 13 да 18 градусаў цяпла, а вось удзень крыху пахаладнее — плюс 21—27. Праўда, па Гомельшчыне сіноптыкі чакаюць да 31 градуса. Вецер будзе няўстойлівы слабы, але паступова ўзмоцніцца да ўмеранага.

У чацвер зона дажджоў пакіне Беларусь. Невялікія ападкі магчымы толькі месцамі. Чакаецца пераменная воблачнасць. Ноччу і раніцай каля вадаёмаў могуць узнікаць непрацяглыя туманы. Тэмпературны фон да ўсходу сонца застанецца такі ж, як і ў сераду, а вось удзень стане на пару градусаў цяплей. На поўдні — усё тыя ж плюс 31. Такі характар надвор'я захаваецца і ў пятніцу. Па папярэдніх прагнозах, на большай частцы тэрыторыі краіны цёпла будзе і ў выхадныя. Адным словам, лета!

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

---

Будзь у курсе!

## Адкрыецца сезон масавага палявання на птушак

**Летне-асенні сезон палявання, які стартаваў з палявання на бакаса, набірае абароты. З другой суботы жніўня (з 8-га чысла) можна будзе здабываць вадаплаўную (акрамя гусей) і балотную дзічыну, а таксама слонку, вяхіра, голуба шызага, перапёлку і фазана.**

Паляванне дазволена ў светлы час сутак наступнымі спосабамі: з засады, з падыходу, з пад'езду з маламерных суднаў без рухавікоў або з выключанымі рухавікамі. Дазваляецца выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю і патроны са шротам, паляўнічых сабак усіх груп, акрамя ганчакоў і хартоў. Дапускаецца безружэйнае паляванне з лоўчымі птушкамі, нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Таксама з другой суботы жніўня адкрываецца паляванне на цецерука. Але паколькі гэты від нарміруецца, то яго здабыча вядзецца на падставе атрыманага ў паляўнічай гаспадарцы дазволу і паляўнічай пуцёўкі да яго. Паляваць можна толькі ў светлы час сутак на асобін любога полу і ўзросту, акрамя старак (самак, якія водзяць вывадак маладых птушак). Спосаб палявання — ружэйны з падыходу толькі з паляўнічымі сабакамі парод выжла, спаніэль, рэтрывер (з адным сабакам — да трох паляўнічых) з ужываннем гладкаствольнай паляўнічай зброі і патронаў са шротам.

З першай суботы верасня (5-е чысло) будзе дазволена здабываць рабчыка і шэрую курапатку, а з трэцяй суботы верасня (19-е чысло) — гусь белалобую, гуменніка, гусь шэрую і канадскую казарку.

Працягнецца летне-асенні сезон палявання на птушыную дзічыну да другой нядзелі снежня (13-е чысло).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

---

## З пачатку года — больш за 880 лясных пажараў

**Паводле інфармацыі прэс-службы Міністэрства лясной гаспадаркі, сёлета адбыліся ўжо 883 лясныя пажары на плошчы больш за 6,5 тысячы гектараў. Нягледзячы на тое, што колькасць узгаранняў з пачатку гэтага года большая, чым за аналагічны перыяд 2019-га, агульная плошча лясных пажараў на адпаведную дату зараз меншая. Гэта сведчыць пра тое, што большасць агачоў узгарання была ліквідавана на ранняй стадыі.**

Больш за ўсё лясных пажараў адбылося на поўдні краіны — у Брэсцкай (325) і Гомельскай абласцях (238). Затым ідуць Мінская (135), Гродзенская (85) і Магілёўская вобласці (75). Менш за ўсё ўзгаранняў было на поўначы краіны — у Віцебскай вобласці (25).

Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў дзейнічаюць у 25 раёнах Беларусі. Наведваць лес часова забаронена ў Івацэвіцкім, Бярозаўскім і Пружанскім раёнах Брэсцкай вобласці, а таксама ў Шчучынскім раёне Гродзенскай. Абмежаванні дзейнічаюць у Гродзенскім, Свіслацкім і Слонімскім раёнах. Што датычыцца Мінскай вобласці, то тут наведванне лясоў абмежавана ў 14 раёнах: Вілейскім, Маладзечанскім, Крупскім, Мінскім, Смалявіцкім, Бярэзінскім, Уздзенскім, Нясвіжскім, Клецкім, Слуцкім, Старадарожскім, Салігорскім, Любанскім і Стаўбцоўскім. У Гомельскай вобласці абмежаванні ўведзены ў Акцябрскім, Рэчыцкім, Мазырскім і Ельскім раёнах.

Рашэнні аб увядзенні і зняцці забароны на наведванне лясоў прымаюць мясцовыя органы ўлады па хадайніцтве лесагаспадарчых устаноў або раённых аддзелаў па надзвычайных сітуацыях. Абмежаванні ўводзяцца ў выпадку высокага класа пажарнай небяспекі і здымаюцца пры стабілізацыі становішча. Галоўная мэта забарон — забяспечыць бяспеку грамадзян, захаванасць іх маёмасці, а таксама ляснога фонду.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

---

## ДЗЕЦІ ЎКРАЛІ Ў ЛЕСЕ ВЯДРО ЧАРНІЦ

**У аператыўна-дзяжурную службу Любанскага РАУС звярнулася 76-гадовая жыхарка раёна. Яна паведаміла пра тое, што нехта ў лясным масіве паблізу яе вёскі выкраў чарніцы з вядра.**

Супрацоўнікі міліцыі хутка ўстанавілі, што да крадзяжу ягад датычацца трое жыхароў найбліжэйшай вёскі ва ўзросце 11-12 гадоў.

Як паведамляе УУС Мінскага аблвыканкама, юныя выкрадальнікі растлумачылі, што знаходзіліся ў лесе, дзе займаліся зборам чарніц. У нейкі момант адзін з іх прынёс цэлае вядзерца ягад і высыпаў у свае вялікае вядро. Праз некаторы час ён зноў прынёс поўнае вядзерца. Яго сябры здзівіліся хуткасці збору і пацікавіліся, як ім рабіць гэта так жа хутка. Хлопчык расказаў, што знайшоў цэлае вядро чарніц, паказаў ім, дзе яно знаходзіцца.

Убачыўшы вядро, малыя, скарыстаўшыся адсутнасцю гаспадыні, запоўнілі свае вядзерцы чарніцамі і пайшлі дадому. Крадзеныя ягады яны рэалізавалі нарыхтоўшчыку.

У выніку шкода была ацэнена ў 28 рублёў. Для малалетніх вяскоўцаў паход у ягады скончыўся разглядам на пасяджэнні камісіі па справах непаўналетніх Любанскага райвыканкама, бо яны не дасягнулі ўзросту, з якога надыходзіць адказнасць. Аднак у інспекцыі па справах непаўналетніх Любанскага РАУС паводзіны хлопчыкаў узялі на заметку: з імі будзе праводзіцца індывідуальна-прафілактычная работа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПРЫЯРЫТЭТЫ АБІТУРЫЕНТАЎ: ПРАГРАМАВАННЕ, МЕДЫЦЫНА, ЗАМЕЖНЫЯ МОВЫ

## Шанцы стаць архітэктарам

Як паведаміла прэс-служба БНТУ, за 31 ліпеня ва ўніверсітэт падалі дакументы 1318 чалавек. Што датычыцца агульнай колькасці пададзеных заяў за сем дзён прыёму на бюджэт, то гэтая лічба складае 5409 пры плане прыёму 2977.

Адметнасцю сёлетняй уступнай кампаніі стала абнаўленне інфармацыі аб пададзеных заявах у рэжыме анлайн, а не адзін раз у тры гадзіны. Таксама ў абітурыентаў была магчымасць афарміць заяву і ліст рэгістрацыі анлайн у асабістым кабінеце і папярэдне запісацца на дзень і час падачы дакументаў. Гэтай магчымасцю скарысталася больш як 2300 чалавек.

Самы высокі конкурс на дзённае аддзяленне за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту сфарміраваўся традыцыйна па спецыяльнасці «Маркетынг» факультэта маркетынгу, менеджменту, прадпрымальніцтва — 7,5 чалавека на месца (план прыёму на бюджэт — 2), максімальны бал тых, хто прэтэндаваў, — 355. Гэта значыць, што абітурыенты мэтанакіравана плануюць паступаць на платную форму навучання нягледзячы на складанасці атрымання эканамічнай адукацыі ў тэхнічнай ВНУ, дзе ў праграме немалая колькасць спецыяльных прадметаў політэхнічных кірункаў.

Далей ідзе спецыяльнасць «Архітэктура» з конкурсам 5,2 чалавека на месца, максімальны бал — 271 (трэба ўлічваць, што на гэту спецыяльнасць, акрамя двух прадметаў на ЦТ, трэба здаваць яшчэ і ўнутраны іспыт). Трэцяе месца займае спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» факультэта інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі з конкурсам 5 чалавек на месца (153 чалавекі ўказалі менавіта гэтую спецыяльнасць прыярытэтнай пры паступленні на факультэт), максімальны бал — 368.

На чацвёртай пазіцыі спецыяльнасць «Эканоміка і арганізацыя вытворчасці (прыборабудаванне)» машынабудаўнічага факультэта з конкурсам у 4,3 чалавека на месца. Спецыяльнасць «Эканоміка і арганізацыя вытворчасці (машынабудаванне)» таго ж факультэта заняла шостую пазіцыю ў спісе: конкурс склаў 3,87 чалавека на месца. Характэрна, што на 25 бюджэтных месцаў у групе гэтых спецыяльнасцяў пададзена 101 заява. Пяты радок займае спецыяльнасць «Аўтасэрвіс» аўтатрактарнага факультэта з конкурсам 4 чалавекі на месца, максімальны бал — 329.

Максімальны бал у абітурыентаў, што падалі дакументы ў БНТУ, — 388.

## Высокая планка

Традыцыйна адны з самых высокіх балаў рэгіструюцца штогод на пэўных спецыяльнасцях у БДУ і БДУІР. Так, у апошні ўніверсітэт падала дакументы абітурыентка з сумай балаў 394. Вікторыя Бобр скончыла Мазырскі дзяржаўны абласны ліцэй з залатым медалём. Два апошнія гады дзяўчына вучылася ў фізіка-матэматычным класе. Абодва профільныя прадметы — матэматыку і фізіку — яна здала на 98 балаў, а па беларускай мове атрымала максімум — «сотку». Сярэдні бал атэстата абітурыенткі — 9,8. Вікторыя хоча стаць праграмістам і падала дакументы на факультэт камп'ютарных сістэм і сетак (ФКСІС) на спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій». Увогуле сюды на 85 бюджэтных месцаў была пададзена 331 заява.



Фота прэс-службы БДУІР.

Затым планка паднялася яшчэ вышэй: на інжынерна-эканамічны факультэт на спецыяльнасць «Эканоміка электроннага бізнесу» падала дакументы Валерыя Рамановіч, у актыве якой 396 балаў. Яна атрымала максімум балаў па англійскай мове і матэматыцы. Тэст па рускай мове здала на 96 балаў. Лунінецкую гімназію дзяўчына скончыла на выдатна — у яе атэстаце чаканыя 10 балаў.

Абітурыентаў, якія па суме балаў патрапілі ў прамежак ад 381 да 390, у БДУІР — адзінаццаць. Восем з іх выбралі факультэт камп'ютарных сістэм і сетак і трое — інжынерна-эканамічны факультэт.

Але не ўсе спецыяльнасці ў БДУІР зацікавілі абітурыентаў. Нават на такую перспектыўную, як «Нанатэхналогіі і нанаматэрыялы ў электроніцы», было ўсяго 7 ахвотных на 25 бюджэтных месцаў. На спецыяльнасці «Праграмна-кіруемыя электронна-аптычныя сістэмы» — 8 ахвотных на 20 месцаў, «Мадэляванне і камп'ютарнае праектаванне радыёэлектронных сродкаў» — 11 ахвотных на 25 месцаў. На факультэце радыётэхнікі і электронікі на ўсіх спецыяльнасцях колькасць пададзеных заяў была меншай за кантрольныя лічбы прыёму.

Праўда, варта адзначыць, што залічэнне ў БДУІР адбываецца па агульнаўніверсітэцкім конкурсе. І калі абітурыент не праходзіць па першай згаданай ім спецыяльнасці, то электронная сістэма правярыць, ці праходзіць ён па сваіх балах на другую спецыяльнасць у яго спісе прыярытэтаў, на трэцюю і гэтак далей. Тых, хто не прайшоў ні на адну з іх, камісія запісвае яшчэ ў адзін спіс. І пры наяўнасці свабодных месцаў гэтыя абітурыенты могуць залічвацца на іншыя спецыяльнасці.

Пасяджэнне прыёмнай камісіі, на якой адбудзецца залічэнне, пройдзе ў БДУІР 6 жніўня. Пратакол аб залічэнні будзе апублікаваны на сайце да 18 гадзін. У электронным кабінеце абітурыента таксама з'явіцца інфармацыя аб тым, на якую спецыяльнасць ён прайшоў. Аднак гэта не апошняе рашэнне прыёмнай камісіі. Некаторыя абітурыенты забіраюць дакументы з-за таго, што не патрапілі на спецыяльнасць, якая была ў прыярытэце. Яны падаюць дакументы на платную форму навучання або забіраюць іх з універсітэта наогул. У выніку могуць яшчэ вызваліцца бюджэтныя месцы.

## 101 «стабальнік» у БДУ

Падвялі першыя вынікі ўступнай кампаніі і ў БДУ. 71,3 % яго абітурыентаў маюць высокі сумарны вынік — вышэй за 300 балаў (у 2019 годзе іх было 66,5 %). На дзённую бюджэтную форму навучання пададзена 3496 заяў пры плане прыёму 2140. Сярэдні конкурс склаў 1,63 чалавека на месца.

Сярод тых, хто будзе залічаны без экзаменаў, 72 пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд. Абітурыентаў, якія скончылі сярэднюю школу з медалём або сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы з дыпломам з адзнакай, — 898, гэта чвэрць ад агульнай колькасці. Сярод тых, хто падаў дакументы, 1737 выпускнікоў ліцэяў і гімназій. Абітурыентаў, якія атрымалі на ЦТ 100-бальны вынік, — 101 чалавек (у 2019 годзе было 86).

На факультэце міжнародных адносін БДУ адразу ў васьмі абітурыентаў сума балаў — ад 391 да 400. Але ёсць абітурыенты з сумай балаў, набліжанай да максімуму, і на іншых факультэтах: юрыдычным, гістарычным, факультэце журналістыкі, факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, фізічным, філалагічным, хімічным.

Там, дзе праводзяцца ўнутраныя выпрабаванні, найбольш высокія конкурсы склаліся на спецыяльнасцях «Дызайн» (кірунак — камунікацыйны) — 13,7 чалавека на месца пры плане прыёму — 6; «Дызайн» (кірунак — дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя) — 10 чалавек на месца пры плане прыёму — 6; «Правазнаўства» (скарочаная форма навучання) — 3,9 чалавека на месца пры плане прыёму — 10.

На завочную бюджэтную форму навучання падалі дакументы 565 абітурыентаў пры плане прыёму 218 чалавек, конкурс склаў 2,6 чалавека на месца.

У тым ліку на скарочаны тэрмін навучання падалі дакументы 323 абітурыенты пры плане прыёму 68, конкурс склаў 4,8 чалавека на месца.

## Хачу быць перакладчыкам

Не адчувае дэфіцыту абітурыентаў традыцыйна Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. Тут на лячэбны факультэт на 220 месцаў было пададзена 387 заяў. На стаматалагічным факультэце на 50 месцаў — 113 ахвотных, на педыятрычным — 180 бюджэтных месцаў і 284 ахвотных, на фармацэўтычным — 60 месцаў і 109 прэтэндэнтаў на іх. У шасці абітурыентаў БДМУ сума балаў была ў дыяпазоне ад 391 да 400.

Вельмі высокія прахадныя балы склаліся ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце. Што вельмі важна, у гэтай ВНУ папярэднюю інфармацыю аб прахадных балах і спісы абітурыентаў, рэкамендаваных да залічэння на першы курс, размясцілі яшчэ 31 ліпеня.

На перакладчыцкім факультэце на спецыяльнасці «Англійская мова і другая замежная мова» прахадны бал склаў 382, на спецыяльнасці «Нямецкая мова і другая замежная мова» — 372, «Іспанская мова і другая замежная мова» — 364, «Турэцкая і другая замежная мова» — 355, «Французская і другая замежная мова» — 344.

На факультэце міжкультурных камунікацый паўпрахадны бал на спецыяльнасці «Англійская мова і другая замежная мова» быў 371. На спецыяльнасці «Італьянская мова і другая замежная мова» прахадны бал — 366, «Нямецкая мова і другая замежная мова» — 362. А на факультэце кітайскай мовы і культуры на спецыяльнасці «Кітайская мова і другая замежная мова» прахадная планка склала 365 балаў.

Нагадаем, што яшчэ адзін шанц, якім абітурыенты могуць скарыстацца, — гэта дадатковы набор на бюджэтныя месцы, што засталіся вакантныя. На іх змогуць прэтэндаваць абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе пры паступленні ў іншыя ВНУ, але маюць на руках патрэбныя сертыфікаты або паступалі на іншыя спецыяльнасці ў тую ж ВНУ.

Ваенная акадэмія, Універсітэт грамадзянскай абароны МНС, Інстытут пагранічнай службы і ваенныя факультэты павінны праінфармаваць абітурыентаў аб наяўнасці вакантных месцаў да 6 жніўня, астатнія дзяржаўныя ВНУ — да 12 жніўня.

Ад абітурыентаў, якія паступаюць на платнай аснове, але не здаюць уступныя экзамены ў ВНУ, дакументы будуць прымаца да 10 жніўня — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС і Універсітэце грамадзянскай абароны МНС; да 13 жніўня — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў; да 15 жніўня — ва ўсіх іншых установах вышэйшай адукацыі.

Да 19 жніўня ў Міністэрстве адукацыі працуе «гарачая лінія» (017) 222 43 12, на якую прымаюцца званкі па ўсіх пытаннях, звязаных з паступленнем ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Меркаванне

### «Па ўзроўні адукаванасці наша краіна займае годнае месца сярод усіх краін свету»

**Таццяна АЎТУХОВА, член Пастаяннай камісіі Палаты Прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы:**



«Адно з дасягненняў сферы адукацыі за 25 гадоў — высокі ўзровень адукаванасці насельніцтва. Шмат увагі ўдзяляецца ўсёй сістэме: многа будуецца дашкольных устаноў адукацыі, устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны імкнуцца атрымаць званне «Універсітэт 3.0», адкрываюцца новыя запатрабаваныя на рынку працы спецыяльнасці і многае іншае», — кажа дэпутат.

Як расказала Таццяна Аўтухова, Міністэрства адукацыі і профільная камісія ніжняй палаты парламента пачынаюць работу над новымі правіламі прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

«Падыходы неабходна крыху змяніць у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі, — расказвае парламентарый. — Для паступлення на некаторыя спецыяльнасці неабходна жывая размова экзаменатара і таго, хто экзаменуецца. І гэта адно з самых важных змяненняў, якія будуць унесены ў новыя правілы».

**Запісала Марыя ДАДАЛКА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 30 %) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «УПРАВЛЯЮЩАЯ КОМПАНИЯ ХОЛДИНГА «ГРОДНООБЛСЕЛЬХОЗТЕХНИКА»

| Предмет торгов | Начальная цена с учетом НДС, руб. | Сумма задатка (1 %), руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1 – Свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2,** 2006 г. в., зав. № 2210041, рег. № СК-4 2814 | 62 640,00 | 626,00 |
| **Лот № 2 – Свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2,** 2007 г. в., зав. № 2310039, рег. № СК-4 2817 | 61 320,00 | 613,00 |
| **Лот № 3 – Свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2,** 2007 г. в., зав. № 2310033, рег. № СК-4 2813 | 59 520,00 | 595,00 |
| **Лот № 4 – Свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2,** 2008 г. в., зав. № 2310060, рег. № СК-4 2832 | 100 613,98 | 1 006,00 |
| **Лот № 5 – Свеклоуборочный комбайн HOLMER Terra Dos T2,** 2005 г. в., зав. № 192805, рег. № б/н | 172 200,00 | 1 722,00 |
| **Местонахождение имущества:** Гродненская обл., Щучинский р-н, аг. Рожанка (ОАО «Щучинский ремонтный завод») | | |
| **Сведения о продавце:** ОАО «Управляющая компания холдинга «ГродноОблсельхозтехника», г. Гродно, ул. Лермонтова, 2, тел. 8 (0152) 742081 | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка:** Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, счет № BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906 | | |
| **Торги состоятся 14 августа 2020 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| **Срок подачи документов для участия в торгах** | **по 10 августа 2020 г. включительно, до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** | |

Аукцион без условий. Шаг аукциона – 5 %. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 рабочих дней с момента проведения аукциона. **Условия оплаты:** 100 % предоплата. Условия участия и порядок проведения аукциона – по тел. 8 (0152) 621632 и на сайте www.fincentr.by. Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 06.05.2020 г., 09.06.2020 г., 24.06.2020 г., 21.07.2020 г.

И З В Е Щ Е Н И Е О П Р О В Е Д Е Н И И А У К Ц И О Н А

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 11 сентября 2020 года проводит 15-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 146 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66 из-под радиостанции Р-140-05 в составе: автошасси ГАЗ-66 Р-140 0.5, ш. ХТН006615J0552703, рег. № АЕ 1530-2, 1987 г., пробег 389 км, кузов-фургон К-66 1987 г. | г. Витебск, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 147 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном К-66 из-под радиостанции Р-140-05 в составе: автошасси ГАЗ-66-15 (Р-140-05), ш. ХТН006615L0622564, рег. № АА 5427-2, 1990 г., пробег 318 км, кузов-фургон К-66 1990 г. | г. Витебск, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 148 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном К-66 из-под радиостанции Р-140-05 в составе: автошасси ГАЗ-66-15 (Р-140-05), ш. ХТН006615L0609238, рег. № АА 5434-2, 1990 г., пробег 317 км, кузов-фургон К-66 1990 г. | г. Витебск, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 149 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66 из-под радиостанции Р-140-05Ш в составе: автошасси ГАЗ-66 Р-140-05Ш, ш. 0528991, рег. № 3512 ВТП, 1988 г., пробег 884 км, кузов-фургон К-66 1988 г. | г. Витебск, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 150 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66 из-под радиостанции Р-140-05 в составе: автошасси ГАЗ-66 Р-140-05, ш. 0469304, рег. № 3515 ВТП, 1986 г., пробег 1440 км, кузов-фургон К-66 1986 г. | г. Витебск, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 151 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66 из-под радиостанции Р-140-05 в составе: автошасси ГАЗ-66 Р-140-05, ш. 0528649, рег. № 3518 ВТП, 1988 г., пробег 493 км, кузов-фургон К-66, 1988 г. | г. Витебск, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 152 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66 из-под радиостанции Р-142 в составе: автошасси ГАЗ-66 (Р-142), ш. 0344153, рег. № АА 5436-2, 1983 г., пробег 1337 км, кузов-фургон К-66 1983 г. | г. Витебск, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 153 | ГАЗ 66, ш. 0483420 с кузовом-фургоном К-66Н № 46780, 1987 г., 3 кат., пробег 5096 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 4 500,00 | 900,00 |
| 154 | ГАЗ 66, ш. ХТН006611М0658035 с кузовом-фургоном К-66Н № 17680, 1991 г., 3 кат., пробег 3168 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 4 500,00 | 900,00 |
| 155 | ГАЗ 66, ш. ХТН006615I0526678 с кузовом-фургоном К-66Н, № 018688, 1988 г., 3 кат., пробег 9523 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 4 500,00 | 900,00 |
| 156 | ГАЗ 66, ш. ХТН006614I0549427 с кузовом-фургоном К-66Н № 193888, 1988 г., 3 кат., пробег 4086 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 4 500,00 | 900,00 |
| 157 | ГАЗ 66, ш. ХТН006614J0553345 с кузовом-фургоном К-66Н № 201888, 1988 г., 3 кат., пробег 8601 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 4 500,00 | 900,00 |
| 158 | ГАЗ 66, ш. 0454221 с кузовом-фургоном К-66Н № 114286, 1986 г., 3 кат., пробег 8370 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 4 500,00 | 900,00 |
| 159 | ГАЗ 66, ш. 0482844 с кузовом-фургоном К-66Н № 33780, 1987 г., 3 кат., пробег 6408 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 4 500,00 | 900,00 |
| 160 | ГАЗ 66, ш. 0652586 с кузовом-фургоном К-66Н № 18080, 1991 г., 3 кат., пробег 1930 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 4 500,00 | 900,00 |
| 161 | Автоцистерна АЦ-8,7-5320 № 1061 на базе КамАЗ-5320, ш. ХТС532000Н0265794, 1987 г., 3 кат., пробег 22656 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 19 945,00 | 3 989,00 |
| 162 | КамАЗ-4310, ш. ХТС431000J0050441 с кузовом-фургоном К2.4320 № 12207, 1988 г., 3 кат., пробег 10841 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 17 730,00 | 3 546,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **11 сентября 2020 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 8 сентября 2020 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **11 сентября 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусского рубля за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:
белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.
Справки по тел./факс: (017) 398 05 41.

Результаты проведения рекламной игры

## «Айфономания. Тур 4»

Наименование рекламной игры: «Айфономания. Тур 4».
Территория проведения: Республика Беларусь.
Период проведения: с 03 июля 2020 года по 12 августа 2020 года.
В рекламной игре приняли участие 28 456 человек.
Призовой фонд игры разыгран полностью.

**Обладателями приза: Смартфон Apple iPhone 11 PRO 64 GB Midnight Green, Model A2215, MWC62RM/A + денежное вознаграждение в размере 406,88 (четыреста шесть) белорусских рублей 88 копеек стали:**

1. Дановская Ольга Викторовна, г. Минск;
2. Барьяш Алёна Владимировна, г. Барановичи;
3. Сейидова Анна Алексеевна, г. Минск;
4. Самохвал Анатолий Евгеньевич, г. Минск;
5. Назаров Владислав Александрович, г. Минск.

**Обладателями приза: Денежный приз в размере 2 737,70 (две тысячи семьсот тридцать семь) белорусских рублей, 70 копеек стал:**

1. Христинин Николай Юрьевич, г. Минск.

**Обладателями приза: Денежный приз в размере 1 358,39 (одна тысяча триста пятьдесят восемь) белорусских рублей, 39 копеек стали:**

1. Кулеш Анна Юрьевна, г. Минск;
2. Циколенко Ольга Борисовна, г. Кричев.

**Обладателями приза: Денежный приз в размере 668,73 (шестьсот шестьдесят восемь) белорусских рублей, 73 копейки стали:**

1. Бурганский Виктор Леонидович, г. Минск;
2. Кармызова Асия Камильевна, г. Минск.

**Обладателями приза: Подарочный сертификат на покупку товаров в интернет-магазине e-dostavka.by номиналом 50 рублей. Срок действия – 31.07.2020–30.08.2020 стали:**

1. Турчинович Дарья Иосифовна, г. Минск;
2. Галкова Алеся Петровна, г. Минск;
3. Галкова Алеся Петровна, г. Минск;
4. Дружинин Алексей Владимирович, г. Минск;
5. Шперх Екатерина Александровна, д. Краснополье;
6. Казыро Светлана Константиновна, г. Минск;
7. Козминская Лариса Александровна, г. Минск;
8. Николаевич Александр Дмитриевич, г. Минск;
9. Семешкин Алексей Александрович, г. Минск;
10. Олех Кристина Юрьевна, д. Тарасово;
11. Матюкевич Аксана Александровна, д. Козловщина;
12. Митенкова Юлия Игоревна, г. Минск;
13. Клекель Екатерина Валерьевна, г. Минск;
14. Степанюк Анастасия Викторовна, г. Минск;
15. Силик Юлия Николаевна, д. Клетыще;
16. Яновская Оксана Александровна, г. Минск;
17. Минец Ольга Ромуальдовна, д. Гатово;
18. Ляшкевич Диана Валентиновна, г. Минск;
19. Агеенко Мария Александровна, г. Минск;
20. Канаш Елена Александровна, г. Минск;
21. Радюк Павел Леонович, г. Минск;
22. Бутовская Валерия Олеговна, г. Минск;
23. Гузарик Наталья Владимировна, д. Деревная;
24. Александрович Алексей Александрович, г. Минск;
25. Тиринов Иван Сергеевич, г. Минск;
26. Борисюк Александр Дмитриевич, г. Минск;
27. Пашко Алла Александровна, д. Крупки;
28. Зиневич Денис Станиславович, г. Минск;
29. Пискун Юлия Сергеевна, г. Минск;
30. Михайлова Александра Сергеевна, г. Минск;
31. Чепикова Алевтина Владимировна, г. Жлобин;
32. Куракевич Антон Сергеевич, г. Минск;
33. Згурская Ольга Николаевна, г. Минск;
34. Дегтярева Елена Владимировна, д. Равнополье;
35. Протасович Ксения Сергеевна, г. Минск;
36. Ким Светлана Рудольфовна, г. Минск;
37. Коренчук Алексей Эдуардович, г. Минск;
38. Жарикова Мария Александровна, г. Кричев;
39. Путято Светлана Анатольевна, д. Журавы;
40. Глаз Ольга Ивановна, г. Минск;
41. Слепцова Татьяна Анатольевна, г. Полоцк;
42. Радкевич Ольга Николаевна, г. Минск;
43. Заяц Марина Геннадьевна, г. Минск;
44. Леонович Светлана Сергеевна, д. Новоселки;
45. Долматова Анна Геннадьевна, г. Островец;
46. Соловьева Валентина Николаевна, г. Минск;
47. Буяльский Владимир Ярославович, г. Минск;
48. Сидоренко Наталья Владимировна, г. Осиповичи;
49. Аргунова Анастасия Андреевна, г. Витебск;
50. Переверзев Андрей Анатольевич, г. Минск.

Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «АМК «РЭПКА», УНП 191728827, Республика Беларусь, г. Минск, 220053, ул. Будславская, 2, оф. 11.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3809 от 29.06.2020 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 29 726 90 08.

## Извещение об открытом аукционе по продаже права проектирования и строительства группы блокированных жилых домов по ул. Коммунальной, 32 в городе Гродно 8 сентября 2020 года

| № п/п | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га/ срок аренды | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, рубля | Сумма задатка, рубля | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рубля | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, рубля |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | г. Гродно ул. Коммунальная, 32 | 1,6990/ 5 лет | группа блокированных жилых домов (30–35 квартир) 2-этажных с мансардным этажом, со встроено-пристроенными гаражами и благоустройством территории | 61 759,77 | 6 175,00 | 12 077,45 | Снос зданий, сооружений, зеленых насаждений, попадающих под пятно застройки | 1 128 676,00 |

Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу. Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона. Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Гродненским горисполкомом).

**Аукцион состоится 8 сентября 2020 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1**.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 Главное областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляется: индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона (его представитель), предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 10 августа по 02 сентября 2020 года**.

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Гродненским горисполкомом рассрочки ее внесения);

- возместить расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.

Оплата стоимости права заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка Гродненский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) не позднее 2 рабочих дней после внесения соответствующих оплат.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Телефоны для справок в Гродно: (0152) 72-05-37, 72-00-10. Адреса сайтов: Гродненского городского исполнительного комитета – http://grodno.gov.by, организатора аукциона – http://gcn.by**

Цяпер і ў нас

# Без чаргі і за лічаныя хвіліны

## Як здаюць экспрэс-тэст на каранавірус

**З мінулага тыдня экспрэс-тэсціраванне на COVID-19 даступнае ў многіх паліклініках краіны, у тым ліку і ў невялікіх гарадках і пасёлках гарадскога тыпу. Яно платнае і каштуе для беларусаў у сярэднім 18—22 рублі. Усё проста: папярэдні запіс па тэлефоне ў любой тэрытарыяльна зручнай паліклініцы (за дзень да аналізу), аплата, здача крыві — і праз некалькі гадзін гатовы вынік. Іншая рэч, што калі вы перахварэлі даўно (месяц і больш таму), антыцелы могуць не захавацца ці ўвогуле не выпрацавацца, калі хварэлі ў лёгкай форме. Таму ў большасці з тых, хто цяпер правяраецца, антыцел не выяўляюць.**


Загадчык клініка-дыягнастычнай лабараторыі 11-й гарадской паліклінікі Вікторыя САЧАК.

Штосьці падобнае да каранавіруса — з тэмпературай і болем у горле — я перанесла месяц таму, і хоць шанцаў выявіць антыцелы няшмат, цікава ўсё ж дакладна ведаць свой «статус». Па тэлефоне ў рэгістратуры 11-й гарадской паліклінікі Мінска мяне запісваюць на наступны дзень, на 11.40, папярэджваюць, што варта прыйсці нашча і з пашпартам. У азначаны час накіроўваюся ў касу для аплаты. Прапануюць падпісаць стандартную дамову на платныя паслугі, аплачваю 21 рубель 77 капеек і атрымліваю накіраванне на аналіз да парадкавым нумарам 13. Менавіта столькі чалавек у гэты дзень вырашылі праверыцца тут на COVID-19. У працэдурным кабінеце чаргі няма, забор крыві з вены займае лічаныя хвіліны — і ўсё, застаецца чакаць вынік.

Менавіта такі экспрэс-тэст у бюджэтных медыцынскіх установах робіцца кантактам першага ўзроўню, а таксама тым, хто атрымаў станоўчы ПЦР-тэст і знаходзіцца пад медыцынскім назіраннем ці лечыцца. Цяпер магчымасць праверыцца на платнай аснове ёсць ва ўсіх ахвотных.


Карэспандэнт «Звязды» падчас здачы крыві на антыцелы да COVID-19.

— Людзям цікава ведаць, хварэлі яны на каранавірус ці не, — расказвае **ўрач лабараторнай дыягностыкі, загадчык клініка-дыягнастычнай лабараторыі 11-й гарадской паліклінікі Вікторыя САЧАК**. — На экспрэс-тэсціраванне прыходзяць людзі розных узростаў, найперш тыя, хто сочыць за сваім здароўем ці баіцца гэтай інфекцыі. Абследуюцца і тыя, хто едзе за мяжу, — проста для сябе. Як правіла, калі чалавек моцна хварэе, тэст будзе станоўчы. А пры лёгкай форме антыцел можа не быць.

Мінчанка Маргарыта вырашыла зрабіць тэст якраз перад паездкай на адпачынак — менавіта для ўласнага заспакаення, каб за мяжой яе стан здароўя не пагоршыўся і не спатрэбілася медыцынская дапамога. А вось малады чалавек, які прадставіўся Аляксандрам, кажа, што хоча праверыцца, бо некалькі дзён таму ўвечары ў яго паднялася тэмпература да 38,5, трымалася да раніцы, праз дзень зноў павысілася да 37,5.

— Вырашыў праверыцца для ўпэўненасці — хварэю ці не. Днём адчуваю сябе нармальна, тэмпературы няма, урач нават бальнічны, напэўна, не дасць, але адкуль гэта тэмпература ўвечары, не зразумела, — разважае малады чалавек.

Кожны дзень у паліклініцы каля 15—20 ахвотных здаюць экспрэс-тэст. Станоўчым ён аказваецца дзесьці ў дваіх з 15.

— Як правіла, першымі выпрацоўваюцца імунаглабуліны M — у самым пачатку імуннага адказу арганізма. Гэта азначае, што чалавек у цяперашні момант хварэе, — тлумачыць Вікторыя Сачак. — Часта сустракаюцца імунаглабуліны M і G. Гэта пераходная фаза, калі M слабеюць і пачынаюць праяўляцца G — познія антыцелы. Як правіла, гэта адбываецца на 12—20-ы дзень хваробы. Імунаглабуліны G удзельнічаюць у нейтралізацыі вірусных таксінаў, і іх наяўнасць азначае, што чалавек перахварэў. Дарэчы, «злавіць» толькі імунаглабуліны G вельмі складана. І не ва ўсіх яны ёсць, бо далёка не ва ўсіх выпрацоўваюцца антыцелы.

Калі імунаглабуліны G усё ж выяўляюцца, інфармацыя пра такога пацыента паступае ў тэрытарыяльны цэнтр трансфузіялогіі. Там займаюцца нарыхтоўкай плазмы з антыцеламі, якая выкарыстоўваецца ў нас для лячэння цяжкіх хворых. Патэнцыйнаму донару патэлефануюць і прапануюць здаць кроў.

Экспрэс-тэсты, якія выкарыстоўваюць цяпер, кітайскай вытворчасці. Спецыялісты кажуць, што яны зручнейшыя, чым папярэднія. Тыя паказвалі сумарны ўзровень антыцел M і G, і было складана вызначыць, хварэе чалавек ці ўжо перахварэў. Лепш, калі відаць этапы захворвання.

Калі экспрэс-тэст выяўляе імунаглабуліны M, інфармацыя пра хворага паступае ў тэрытарыяльны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі, таксама ў паліклініку па месцы жыхарства пацыента. Гэта значыць, што такога пацыента возьмуць на кантроль. І, безумоўна, адразу інфармуюць самога хворага. Калі хвароба ў пераходнай стадыі (прысутнічаюць імунаглабуліны M+G), то пацыента накіроўваюць да інфекцыяніста і дзейнічаюць у залежнасці ад наяўнасці сімптомаў.

Справа ў тым, што нават калі тэст станоўчы, сімптомы назіраюцца далёка не ва ўсіх. Вікторыя Сачак згадвае: на піку захваральнасці каля 70 % кантактаў першага ўзроўню мелі станоўчыя тэсты, пры гэтым далёка не ўсе мелі адпаведныя сімптомы. Дарэчы, калі раней кантактныя групы паліклінікі, якія працуюць з хворымі на COVID-19, рабілі па тры дзясяткі тэстаў штодзень, то цяпер іх менш за дзясятак.

Для выканання экспрэс-тэста ў пацыента бяруць, як правіла, вянозную кроў. Можна і з пальца, але ў такім выпадку дакладнасць тэста не такая высокая, таму так робяць толькі ў экстранных выпадках.

З крыві атрымліваюць сываратку ці плазму і наносяць яе на тэст-палоскі. Дастаткова 15 хвілін, і вынік гатовы. Праўда, гэтаму папярэднічаюць рэгістрацыя тэста і тое, што спецыялісты называюць пробападрыхтоўкай. Таму забор крыві праводзіцца з 8 да 12 гадзін, а пра вынік можна даведацца пасля 14.

Мой чакана аказваецца адмоўным. Гэта азначае, што на працягу некалькіх апошніх тыдняў я не хварэла на каранавірус (і значыць, тэарэтычна маю ўсе шанцы захварэць).

**Алена КРАВЕЦ.**

Меркаванні

# «Зладжаная сістэма аховы здароўя дапамагла нам справіцца з пандэміяй»

**Анатоль ШЧАСНЫ, рэктар Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук расказаў пра асноўныя прынцыпы, на якіх выбудоўвалася адукацыя медыкаў апошнія дзесяцігоддзі.**



Анатоль Шчасны лічыць, што такі падыход дае плён, і ў будучыні сваіх кадраў ён упэўнены. Яшчэ на пачатку пандэміі яго студэнты па ўласным жаданні выzваліся дапамагаць практыкуючым медыкам хуткай дапамогі, інтэнсіўнай тэрапіі, аддзялення рэанімацыі.

«Мы павінны разумець, што нашых спецыялістаў мы рыхтуем пад практычную ахову здароўя. У адукацыйным працэсе выкарыстоўваем усе напрацоўкі, якія ёсць у сусветнай практыцы не толькі ў адукацыі, але і медыцыне. Гэта новыя навуковыя распрацоўкі, новыя тэхналогіі», — падкрэсліў ён.

Па словах рэктара, пандэмія прымусіла вучыцца дыстанцыйна, што для будучых практыкуючых медыкаў не зусім прадукцыйна. Але пры гэтым была актыўная зваротная сувязь ад студэнтаў.

Пры падрыхтоўцы будучых медыкаў будуць удзяляць увагу арганізацыйнаму складніку, таму што «менавіта зладжаная работа сістэмы аховы здароўя дапамагла нам справіцца з пандэміяй», — рэзюмаваў рэктар.

**Запісала Марыя ДАДАЛКА.**

# «Наша медыцына — на вышыні»

**Галоўны пазаштатны спецыяліст па анэстэзіялогіі і рэаніматалогіі галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сяргей БАБКО адзначае, што за апошнія дзесяцігоддзі беларуская медыцына выйшла на сусветны ўзровень.**



— Укараніліся высокія тэхналогіі, усталявана сучасная апаратура — у тым ліку ва ўсіх аддзяленнях рэанімацыі, ва ўсіх раённых бальніцах. Яшчэ пятнаццаць гадоў таму паўсюль былі праведзены капітальныя рамонты, цяпер праводзяцца бягучыя.

Таму калі да нас раптам прыйшоў нябачны невядомы вораг, мы былі гатовыя. У Беларусі, напрыклад, колькасць апаратаў ШВЛ і рэанімацыйных ложкаў большая, чым у любой іншай краіне Еўропы. І да каранавіруса мы нават абмяркоўвалі: а ці не трэба нам скарачаць ложкавы фонд? Высветлілася, што не трэба.

Мы спрацавалі (і яшчэ працуем) на высокім узроўні. Па аснашчэнні, па апаратуры, па кваліфікацыі кадраў наша медыцына ў аддзяленнях рэанімацыі — на вышыні, што вельмі нам дапамагло цяпер.

Цэняць гэта і медыцынскія турысты, якія часта прыязджаюць у Беларусь аперыравацца ў рэспубліканскія цэнтры, асабліва з нагоды трансплантaлогіі, — з блізкага і далёкага замежжа. Пастаянна адбываецца і абмен досведам паміж нашымі і замежнымі спецыялістамі.

**Запісала Варвара МАРОЗАВА.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»** сообщает о том, что дата проведения электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего учреждению «Санаторно-оздоровительный комплекс «Белая Вежа», извещение о проведении которых опубликовано в газете «Звязда» 30.07.2020, **переносится на 29.08.2020.** Номер Лота 150720001 изменен на номер 310720001. Подробная информация на сайтах Организатора аукциона ino.by, Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на ЭТП «ТОРГИБЕЛ».
**Организатор аукциона:**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 190055182

# ЯК НЕ ЗАБЛЫТАЦЦА Ў ІМЁНАХ?

## Шукаем свой сорт вінаграду

**«Ванечка», «Лідзія», «Надзея», «Віктар», «Лёлік», «Біянка», «Вера», «Святлана», «Гаўрыіл», «Вераніка», «Ілья», «Аркадзія», «Цімур», «Асоль», «Алёшанька», «Назарый», «Атос», «Араміс», «Чарлі»... Не, гэта не імёны кіношных герояў ці малых у дзіцячым садку. Гэта назвы сартоў вінаграду, якія паспяхова растуць у Беларусі — іх я выпісвала падчас выстаўкі, што праводзілася летась у Самахвалавічах.**


Уладзімір УСЦІНАЎ знаёміць з «сонечнай» калекцыяй.


На выставе ў Самахвалавічах.

А пабачыць тут можна было ягады, што выспелі ў садах Інстытута пладаводства і на аматарскіх вінаградніках. Такога выбару вы б не знайшлі ні на адным беларускім кірмашы — больш за дзве сотні сартоў разнастайных колераў і адценняў, памераў, формаў і смакаў. Асобныя гронкі, прывезеныя на выстаўку, цягнулі на тры, а можа, і болей кілаграмаў.

**Вінаград — культура капрызная, але чым больш ёй дагаджаеш, тым больш яна дзякуе ўраджаем.**

Менавіта такія сустрэчы — а ладзяцца яны кожны год — дапамогуць больш даведацца пра пэўныя сарты. Тут можна, напрыклад, убачыць, які шыкоўны ўраджай дае «Вялес», як розняцца кішмішы «Ківін», «Спартанец», «Шарлота». Той, хто робіць з вінаграду напоі, напэўна зверне ўвагу на такія сарты, як «Дублянскі» (ён падыдзе для белага мускатнага віна), «Мускат летні», «Сталкер», «Біянка», «Каберне Нуар».

А чаму не пацікавіцца ў вінаградараў, якія расліны менш уразлівыя да хвароб, лягчэй пераживаюць беларускія зімы і пры якіх умовах найлепш паказваюць сябе?

Будучым садаводам трэба ўлічыць шмат нюансаў: колькі раслін вы зможаце размясціць на сваім участку, як будзеце іх даглядаць, ці гатовы ўкрываць на зіму (большасці сартоў гэта неабходна), як будзеце фарміраваць расліну (магчыма, жадаеце, каб яна, як падрасце, вілася па альтанцы), дзе будуць размяшчацца апоры (ліяне без іх ніяк не абысціся, да таго ж асабліва ўраджайным сартам спатрэбіцца і дадатковая дапамога, вам давядзецца падвязваць цяжкія гронкі). Важна ўлічыць і тэрміны выспявання. Так, сталовыя сарты не паспеюць дайсці ў адкрытым грунце (каб даць ім больш часу, лепш іх садзіць у цяпліцах ці звычайных плёначных парніках). Ды і для якіх мэт вы будзеце вырошчваць сонечную ягаду? Проста, каб ад'есціся ўдосталь, ці каб зрабіць сок, віно, разынкі? А ёсць яшчэ сарты, якія могуць доўга захоўвацца, некаторыя — нават да Новага года.

Навічкам трэба ведаць, што асобны сорт можа прадавацца пад рознымі назвамі. А часам, наадварот, імёны супадаюць у розных сартоў.

Наогул на сёння ў Беларусі расце каля тысячы сартоў і гібрыдаў. І селекцыя не стаіць на месцы. Актыўна над вывядзеннем новых формаў працуюць нашы блізкія суседзі — Расія і Украіна. Робяць свой унёсак у гэту справу і аматары, яны ж спрыяюць прасоўванню новых сартоў на наш рынак.

На навінках можна рабіць бізнес — асабліва апантаныя вінаградары часам гатовы за нашумелыя сарты выкласці і пад сотню долараў, і гэта пры тым, што яшчэ невядома, як сябе гэтая расліна надалей пакажа. Некаторыя аматары прызнаюцца, што часам ім даводзіцца пазбаўляцца ад тых раслін, якія не апраўдалі надзей. Навошта трымаць кусты, якія даюць дрэнны ўраджай (альбо ў іх дробныя ці кіслыя ягады, ці яны моцна хварэюць), калі на гэта месца можна пасадзіць іншыя — больш прадукцыйныя і ўстойлівыя.

Дарэчы, у Мінску пры Палацы ветэранаў працуе клуб вінаградараў. Тут можна атрымаць багата рознай інфармацыі, якая датычыцца вырошчвання сонечнай ягады, абмяняцца кантактамі і замовіць на будучыню ўпадабаныя расліны (чаранкі). Сачыце і за абвесткамі Інстытута пладаводства ў Самахвалавічах: на семінары, лекцыі, майстар-класы варта завітаць не толькі пачаткоўцам, але і вопытным садаводам. Тым больш што на такіх сустрэчах вас завядуць непасрэдна ў сады (яны прызнаныя нацыянальным здабыткам краіны), і вы на ўласныя вочы ўбачыце, як праяўляюць сябе канкрэтныя


Колькі заважыць такая гронка?

расліны. Самі з секатарам паўдзельнічаеце ў абрэзцы лазы вясной, а ўвосень зможаце проста з кустоў прадэгуставаць ягады. Дарэчы, вінаграднікі інстытута займаюць паўтара гектара. У калекцыі больш за 500 сартоў! Вучоныя гадамі назіраюць за тым, як паводзяць сябе «перасяленцы» з іншых краін і могуць падказаць, з якімі заморскімі сартамі вінаграду лепш мець справу.

— Тое, што выжывае ў нас, тым больш будзе расці і ў прыватніка, — кажа **навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур Інстытута пладаводства НАН Беларусі Уладзімір УСЦІНАЎ.**

Нават укрыццё апошнім часам вучоныя робяць умоўнае — два гады запар не выкарыстоўвалі салому, абмяжоўваліся вядром пілавіння на аснову куста. Справа ў тым, што вінограднік даглядае ўсяго пара чалавек, і гэта на тры тысячы «гадаванцаў». Натуральна, не кожная расліна атрымлівае столькі ўвагі, як трэба. А вінаград — культура капрызная, але чым больш ёй дагаджаеш, тым больш яна дзякуе ўраджаем.


Ружа-«індыкатар» падказвае, калі трэба апрацоўваць вінаграднікі.

Не здзіўляйцеся, калі побач з вінаградным лазой убачыце ружы — тут іх спецыяльна саджаюць, каб не прапусціць «атаку» мучністай расы. На ружах хвароба праяўляецца на 2—3 дні раней. А значыць, пакуль яна не пашкодзіла вінаграднікі, можна паспець правесці адпаведныя апрацоўкі.

У Інстытутце пладаводства абыходзяцца мінімальнай колькасцю прэпаратаў. Вясной у красавіку па спячай лазе робіцца выкараняльная апрацоўка (азафосам, медным купарвасам, бардоскай вадкасцю). Другая апрацоўка (комплексная ад несапраўднай і сапраўднай мучністай расы) прыпадае на канец мая — пачатак чэрвеня перад цвіценнем. Яе сумяшчаюць с пазакаранёвымі падкормкамі. Трэцяя — пасля цвіцення (ліпень), чацвёртая — у кастрычніку ці пасля замаразкаў (3—5%-ным растворам мачавіны, салетры), яна дапамагае знішчаць споры грыбкоў.

Традыцыйныя ж вінаграднікі ў прамысловых маштабах апрацоўваюцца каля 20 разоў за сезон.

Уладзімір Усцінаў дзеліцца сваім сакрэтам — яму ўдалося разжыцца чаранком унікальнага сорту японскай селекцыі «Рымскі рубін» (Ruby Roman). Расліна прыжылася, але пладанашэння трэба дачакацца ў наступныя гады. Цікава, як яна праявіць сябе — невядома, гэтаму «скарбу» патрэбны цяплічныя ўмовы. На сёння такія «рубіны» — адны з самых дарагіх сартоў у свеце. Гронкі прадаюцца ад 700 еўра. Кожная ягада (яна памерам з мячык для пінг-понга) штампуецца.

Калекцыю вінаграду інстытут пачаў закладваць 10 гадоў таму, прычым раслінам «дасталіся» даволі бедныя землі, але вучоныя бачаць цудоўныя вынікі і даказваюць, што гэта паўднёвая культура сапраўды сёння выдатна адчувае сябе ў Беларусі. Мы маглі б забяспечваць рынкі прыгожымі, салодкімі ягадамі. Варта сур'ёзна падумаць і пра развіццё тэхнічнага вінаградарства, тым больш што ў сувязі са змяненнямі клімату «класічным» вінаградарскім краінам стане цяжэй вырошчваць сонечныя ягады.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ЗАМЕНА АЛІМПІЯДЗЕ. БЕЛАРУСКАЯ ЛЁГКААТЛЕТЫЧНАЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як і Алімпіяда, беларускія лёгкаатлетычныя гульні распаўсюдзіліся на ўвесь горад. 28 ліпеня спаборніцтвы па штурханні ядра ўпершыню прайшлі не на стадыёне, а на пляцоўцы каля Палаца спорту. «Мне падабаецца такі фармат. Кожны можа падысці і паглядзець на спаборніцтвы, адкрыць для сябе новы від спорту. Такія мерапрыемствы паказваюць людзям, што лёгкая атлетыка — гэта цікава і прыгожа», — адзначыла **пераможніца спаборніцтваў Алена ДУБІЦКАЯ**. У нязвыклых умовах яна штурхнула ядро на 19,19 метра. Трыумфатар сярод мужчын Аляксей Нічыпар паказаў вынік 20,42 метра. Спартыўнае шоу дапоўнілі воднае прадстаўленне ад Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і фаер-шоу. 30 ліпеня на стадыёне Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі прайшлі спаборніцтвы ў бегу на 10 000 метраў, дзе перамаглі Ніна Савіна і Сяргей Краўчэня.

«Мы ўсе засумавалі па спартыўных спаборніцтвах», — прызнаўся **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК** на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця. Пацвердзілі гэта і спартсмены, якія пасля доўгага перапынку адчулі азарт барацьбы. Доказ — новыя нацыянальныя рэкорды. Яны пераўзышлі вынікі, паказаныя на Алімпійскіх гульнях 2016 года ў Рыа.





Спачатку лёгкаатлеты балюча прынялі навіну пра перанос Алімпіяды. Губляць год працы нікому не хацелася. Але гэта дазволіла паказаць выдатныя вынікі на Беларускіх лёгкаатлетычных гульнях. Таццяна Халадовіч кінула кап'ё на 66,85 метра і перасягнула «залаты» вынік Алімпійскіх гульняў 2016 года ў Рыа-дэ-Жанейра. Аднак для медаля ў Токіа ў наступным годзе такога кідка можа і не хапіць. Таму Таццяна не плануе спыняцца і настроеная на яшчэ адзін год плённай працы.

Зоркай у сектары для кідання кап'я стаў і Аляксей Каткавец. 86 метраў 5 сантыметраў — не толькі новы нацыянальны рэкорд Беларусі сярод моладзі, але і паляпшэнне «бронзавага» выніку, паказанага ў Рыа. Дваццацідвухгадовы спартсмен на «Дынама» атрымаў трэці вынік сезона ў свеце.

Як і звычайна, сенсацыю зрабіў скакун у вышыню Максім Недасекаў. Скарыўшы вышыню 2,30 метра, ён паўтарыў найлепшы вынік сезона ў свеце. Скокнуць на 2,33 і 2,36 не атрымалася, але ў Максіма яшчэ ёсць час для адпрацоўкі. «Гэта першыя спаборніцтвы ў сезоне, і мне яшчэ трэба набраць форму. Калі буду выступаць кожны тыдзень, думаю, змагу і 2,35 паказаць. Насамрэч я здзівіўся свайму выніку. 2,25 і 2,30 скокнуў пры дапамозе публікі. Мне ў гэтым сезоне такія высокія вынікі не патрэбныя, а людзям хацелася парадаваць», — прызнаўся Максім.

Нацыянальны рэкорд Беларусі ў скачках з шастом абнавіла Ірына Жук. Узятыя ёю 4,72 метра сталі сапраўднай сенсацыяй, асабліва, калі мець на ўвазе, што гэта першы старт Ірыны ў сезоне: у красавіку ў спартсменкі здарылася траўма. Пасля рэкордных 4,72 яна заказала 4,80, аднак не атрымалася — пакуль не атрымалася.

Палепшыць свой і так добры вынік у 6,81 метра плануе Настасся МіронЧык-Іванова, пераможніца ў скачках у даўжыню: «Я чакала 7 метраў — на жаль, не ўсё атрымалася. Але я не сумую, буду працаваць далей». У Мінску спартсменка палепшыла свой вынік, паказаны на чэмпіянаце свету, — 6,71 метра. Акрамя спартыўнай кар'еры, Настасся пачала кар'еру спявачкі і расказала, што плануе выпусціць лінію адзення. Аднак галоўная мэта не мяняецца — Алімпійскія гульні 2021 года. Далёка паляцеў і яе калега па скачках у даўжыню Уладзіслаў Булахоў: яго пераможны вынік 8,10 метра — паўтарэнне нацыянальнага рэкорду Беларусі сярод моладзі.

Як і ўсе важныя спартыўныя спаборніцтвы, беларускія лёгкаатлетычныя гульні прымусілі спартсменаў кінуць выклік самім сабе. З гэтым удала справілася Хрысціна Ціманоўская. Спачатку яна перамагла ў бегу на 100 метраў, а потым на дыстанцыі 200 метраў. Другой перамогі магло б і не быць: у першы дзень Хрысціна прастудзілася, але знайшла ў сабе сілы выйсці на дарожку. «Мне была прынцыпова важная гэтая перамога. У мяне была тэмпература, усе мяне адгаворвалі. Але я вырашыла, што павінна выйсці і выступіць», — прызналася яна. Дзякуючы сіле духу спартсменка стала двухразовай чэмпіёнкай Беларускіх лёгкаатлетычных гульняў.

Гульні адкрылі імёны спартсменаў, якія яшчэ праявяць сябе ва ўсёй красе. Дзіяна Рабкава перамагла ў сямібор'і. Дагэтуль спартсменка ніколі не набірала больш за 5372 балы, а на «Дынама» завявала 5937. У свае 22 гады яна займае трэцюю пазіцыю ў еўрапейскім рэйтынгу. Выдатны вынік 52,15 секунды паказала Аліна Лучшава, пераможніца ў бегу на 400 метраў. Не адстаюць ад яе і канкурэнткі: Хрысціна Мулярчык абнавіла свой рэкорд — 53,27 секунды. Два разы падымаўся на першую ступень п'едэстала Ілья Карнавухаў. Спачатку ён прыйшоў першы на дыстанцыі 1500 метраў з вынікам 3 хвіліны 44,06 секунды. Дарэчы, гэта яго першы тытул чэмпіёна Беларусі. Другое золата Ілья ўзяў на дыстанцыі 800 метраў, якую адолеў за 1 хвіліну 48,79 секунды. «Залаты дубль на дыстанцыях, дзе заўсёды моцная канкурэнцыя — для мяне неверагодны поспех», — не ўтойваў эмоцый атлет.

Перамога з адценнем суму атрымалася ў Эльвіры Герман. 100 метраў з бар'ерамі яна прабегла за 12,87 секунды: «Я сваім выступленнем незадаволеная. Ведаю, што магу лепш. На кантрольнай трэніроўцы прабегла за 12,70, хоць стан быў жахлівы. І думала, што калі буду добра сябе адчуваць, атрымаецца хутчэй. Не атрымалася. Я не ведаю, у чым прычына, — будзем шукаць адказ», — перажывае спартсменка. Падобныя эмоцыі пасля выступлення засталіся і ў Паўла Барэйшы, пераможцы ў штурханні молата. Ён закінуў молат на 76,23 метра. «Я мог бы паказаць і 78,79 метра, таму перамогай задаволены, а вынікам — не. Але ў мяне ёсць яшчэ год, каб папрацаваць над тэхнікай», — падзяліўся атлет.

Беларускія лёгкаатлетычныя гульні сталі экзаменам для спартсменаў, трэнераў, федэрацыі. Яго паспяхова здалі. «Наша лёгкая атлетыка зрабіла вялікі крок наперад. Мы ўбачылі, што спартсмены ўмеюць сябе падводзіць да важных стартаў і не губляюць дарма час. Вельмі прыемна бачыць амаль алімпійскія вынікі. Спадзяюся, за год хлопцы і дзяўчаты выправяць усе памылкі і выдатна выступяць на Гульнях у Токіа. Прыемна, што рэспубліканскія спаборніцтвы прайшлі на такім высокім арганізацыйным узроўні, на галоўным стадыёне краіны. Мы сталі сведкамі выдатнага свята», — адзначыў **першы намеснік міністра спорту і турызму Вячаслаў ДУРНОЎ.**

Чэмпіянат Беларусі па лёгкай атлетыцы ўжо трэці год праходзіць на «Дынама». Старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім Дзевятоўскі прызнаўся, што сёлета атрымаўся найлепшы турнір па напале, відовішчнасці і атмасферы: «Мне цяжка словамі перадаць свае эмоцыі, сваё захапленне нашымі спартсменамі. Нават не магу вылучыць кагосьці аднаго. Усім прыйшлося цяжка ў гэтым сезоне, пандэмія нікога не пашкадавала. Але ніхто не страціў настрою і кожны працягваў трэніравацца. Яшчэ ёсць час, каб удасканаліць форму і паказаць выдатныя вынікі ўжо не ў Мінску, а ў Токіа. Вялікі дзякуй хачу сказаць гледачам: раней на чэмпіянаце краіны, акрамя трэнераў і спартсменаў, нікога не было, а ў гэтыя дні я бачыў шмат незнаёмых абліччаў. Мы пакуль не сабралі стадыён, але пяць-шэсць тысяч гледачоў — для нас ужо добра. Гэта значыць, што лёд крануўся, і мы ўсё робім правільна».

Спартыўнае шоу дапоўнілі забаўляльная праграма, выступленні артыстаў. Кожны аматар лёгкай атлетыкі мог пазнаёміцца са сваім кумірам на аўтограф-сесіі славутых лёгкаатлетаў. Каралева спорту зноў падарыла сталіцы спартыўнае свята.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**









## Отчет за январь–июнь 2020 года

## ООО «Санта Ритейл», УНП 291313486

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 30 июня 2020 года

тыс. руб.

| АКТИВЫ | Код строки | На 30.06.2020 | На 31.12.2019 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 179 777 | 112 793 |
| Нематериальные активы | 120 | 2 819 | 2 015 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 27 535 | 26 658 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 50 512 | 55 218 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 436 | 476 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **261 079** | **197 160** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 35 621 | 27 859 |
| в том числе: материалы | 211 | 4 122 | 2 153 |
| готовая продукция и товары | 214 | 31 499 | 25 706 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 11 453 | 16 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 6 609 | 3 535 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 15 528 | 6 652 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 44 600 | 56 019 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 2 595 | 6 974 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **116 406** | **101 055** |
| **БАЛАНС** | **300** | **377 485** | **298 215** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **Код строки** | **На 30.06.2020** | **На 31.12.2019** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 107 307 | 72 288 |
| Резервный капитал | 440 | 15 | 15 |
| Добавочный капитал | 450 | 4 079 | 4 090 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | -1 407 | 12 143 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | 2 640 | |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **112 634** | **88 536** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 167 371 | 145 138 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 2 910 | |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 236 | 113 |
| Доходы будущих периодов | 540 | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **170 517** | **145 251** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | | |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 66 | 119 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 89 964 | 64 309 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 79 071 | 60 930 |
| по авансам полученным | 632 | 404 | 150 |
| по налогам и сборам | 633 | 568 | 385 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 930 | 448 |
| по оплате труда | 635 | 2 477 | 1 806 |
| по лизинговым платежам | 636 | 3 523 | 386 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 2 850 | |
| прочим кредиторам | 638 | 141 | 204 |
| Доходы будущих периодов | 650 | 4 304 | |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **94 334** | **64 428** |
| **БАЛАНС** | **700** | **377 485** | **298 215** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–июнь 2020 года

тыс. руб.

| Наименование показателей | Код строки | За январь–июнь 2020 | За январь–июнь 2019 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 251 352 | 172 207 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (195 158) | (139 557) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 56 194 | 32 650 |
| Управленческие расходы | 040 | (5 199) | (3 711) |
| Расходы на реализацию | 050 | (54 930) | (32 683) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | (3 935) | (3 744) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 11 875 | 7 808 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (2 993) | (1 461) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | 4 947 | 2 603 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 3 627 | 2 446 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 2 469 | 6 |
| проценты к получению | 103 | 1 153 | 2 437 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 5 | 3 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (1 654) | (126) |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (1 654) | (126) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | | |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 8 787 | 5 277 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 8 787 | 5 277 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (12 943) | (6 231) |
| в том числе: проценты к уплате | 131 | (6 341) | (3 704) |
